Дзіцячыя пляцоўкі — за кошт жыльцоў?

МС

СТАР. 6

Ад гарбаты з мятай да пушчанскага першака

СТАР. 8

Як пілігрымы да Будслава дайшлі

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

13 ЛІПЕНЯ 2016 г. СЕРАДА № 133 (28243)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЫ Ў ВАС ВЕРЫМ!

Учора адбылася ўрачыстая цырымонія провадаў нашай спартыўнай дэлегацыі на XXXI летнія Алімпійскія гульні.

Фота БЕЛТА.

Яе неад'емнай часткай сталі выбары капітана і сцяганосца зборнай на маючай адбыцца Алімпіядзе. На знакаміты стадыён «Маракана» ў Рыа-дэ-Жанэйра нашу каманду выведзе алімпійскі чэмпіён, шматразовы пераможца чэмпіянатаў свету стралок Сяргей Мартынаў, паведамляе БЕЛТА. Капітанам беларускай зборнай будзе алімпійскі чэмпіён у веславанні на байдарках і каноэ Аляксандр Багдановіч.

Кіраўнік дзяржавы, прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Аляксандр Лукашэнка ўручыў Дзяржаўны сцяг капітану беларускай спартыўнай дэлегацыі. «Памятайце, што вашы высокія вынікі — гэта пазітыўны імідж Беларусі і паказчык яе паспяховага развіцця, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Для беларускіх атлетаў гэтыя Гульні стануць самым важным экзаменам чатырохгоддзя. Наша дзяржава зрабіла ўсё неабходнае, каб вы мелі магчымасць спакойна падрыхтавацца і добра выступіць на гэтых спаборніцтвах», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што цана алімпійскага медаля заўсёды была высокая, і сёння тым больш. «Паглядзіце, як абвастрылася канкурэнтная барацьба. Часта выкарыстоўваюцца неспартыўныя метады ціску на асобных атлетаў і цэлыя краіны. Ужо не выклікаюць здзіўлення скандалы, гучныя выкрыцці, перагляд вынікаў, якія даўно пайшлі ў гісторыю спаборніцтваў, — заўважыў Прэзідэнт. — Вы ўсё гэта бачыце самі, разумееце, упэўнены, перажываеце. У Рыа ўмовы для спаборніцтваў будуць няпростымі, можа быць, цяжкімі. Упэўнены, вы справіцеся з гэтым каласальным напружаннем і пакажаце добры вынік».

Гэтым разам спартсменам не ставілі медальных планаў. Але ж краіна мае права чакаць ад кожнага поўнай канцэнтрацыі і самаадданасці на мяжы чалавечых магчымасцяў, адзначыў Прэзідэнт. Асобна кіраўнік дзяржавы падзякаваў беларускім баскетбалістам, намаганнямі якіх на Алімпійскіх гульнях 2016 года Беларусь зноў будзе прадстаўлена ў гульнявых камандных відах спорту.

Віцэ-прэм'ер беларускага ўрада, старшыня камітэта па падрыхтоўцы да Алімпійскіх гульняў у Рыа Наталля Качанава падкрэсліла: «Для многіх атлетаў уключэнне ў склад каманды, якая накіруецца ў Бразілію, — вялікая перамога. Беларускі народ у ходзе Гульняў будзе пільна сачыць за выступленнямі і падтрымліваць беларускіх спартсменаў».

ПРАЦА НА РАЗВІЦЦЁ

Прэзідэнт прызначыў кіраўнікоў дыпламатычных прадстаўніцтваў нашай краіны ў Кітаі і Грузіі. Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у Кітайскай Народнай Рэспубліцы прызначаны Кірыл Руды. На пасаду Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Грузіі прызначаны Міхаіл Мятлікаў.

«Што тычыцца Кітая, тут цяжка пераацаніць гэтую краіну. Гэта будучыня ўсёй планеты», — падкрэсліў Прэзідэнт, адзначыўшы, што паміж Беларуссю і Кітаем усталяваліся сяброўскія адносіны стратэгічнага характару. «Нам патрэбны рывок у нашых адносінах. Трэба выйсці нават не на новую прыступку, а на арбіту ў адносінах з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Вы бачыце, што яны да гэтага гатовыя, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Я бачу, што яны з адкрытым сэрцам і душой ідуць нам насустрач. У мяне вельмі блізкія сяброўскія адносіны з кіраўніцтвам КНР, і з былым, і асабліва з цяперашнім кіраўніком».

Прэзідэнт запатрабаваў, каб, адпаведна, і беларускі бок быў гатовы аператыўна рэагаваць на існуючыя магчымасці ў развіцці супрацоўніцтва. «Вы павінны дамагчыся таго, каб былі рэалізаваны самыя смелыя, рашучыя прапановы ў адносінах з Кітайскай Народнай Рэспублікай», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кажучы пра Грузію, Прэзідэнт адзначыў: «Грузія прытрымліваецца сваёй палітыкі, адрознай, дапусцім, ад нашай палітыкі. Але гэта права любой краіны вызначаць знешнюю і ўнутраную палітыку. Нам трэба ў гэтай сітуацыі знаходзіць пункты судакранання. Мы іх знайшлі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт паставіў задачу ў разы нарасціць тавараабарот з Грузіяй да ўзроўню ў $200 млн.

Аляксандр Лукашэнка таксама ўзгадніў прызначэнне Уладзіміра Мірановіча генеральным консулам Беларусі ў Стамбуле (Турэцкая Рэспубліка) і Віктара Чараховіча генеральным консулам Беларусі ў Нью-Ёрку (ЗША).

Да родных вытокаў

Станіслаў ПУПКО вярнуўся на радзіму — на Валожыншчыну, у вёску Раднікі, амаль праз 30 гадоў, пражытых у расійскім Нечарназем'і. Цяпер Станіслаў Міхайлавіч, які добра іграе на гармоніку, — жаданы госць на фестывалях і кірмашах, што праходзяць у наваколлі. — Радзіма — сапраўдная жыватворная крыніца, якая дае фізічную і духоўную моц, — кажа зямляк. І не пагадзіцца з ім немагчыма.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Васіль МАЦЮШЭЎСКІ, першы намеснік прэм'ер-міністра:

«Лагістыка — адзін з найбольш перспектыўных кірункаў развіцця эканомікі Беларусі. Гэтаму спрыяе размяшчэнне краіны на шляху транспартных калідораў з захаду на ўсход і з поўначы на поўдзень, а таксама актыўны ўдзел у інтэграцыйных працэсах, у тым ліку ў рамках ініцыятывы Вялікага Шаўковага шляху. Неабходна працягваць работу, накіраваную на павышэнне якасці і комплекснага аказання лагістычных паслуг, забеспячэнне развіцця лагістычнай інфраструктуры і павышэнне эфектыўнасці яе выкарыстання. Пры гэтым якаснаму развіццю лагістычнай сістэмы павінна спрыяць эфектыўнае выкарыстанне транзітнага патэнцыялу Беларусі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.07.2016 г.

Долар ЗША	2,0043	▼
Еўра	2,2275	▲
Рас. руб.	0,0313	■
Укр. грыўня	0,0807	▼

■ Справа маладых

СЮДЫ ТРАПЛЯЮЦЬ САМЫЯ ПАДРЫХТАВАНЫЯ

Моладзь Беларусі, Расіі і Казахстана дапамагае будаваць аб'екты Астравецкай АЭС

Пяць 11-гадзінных працоўных дзён у тыдзень, скарочаная да 15:00-16:00 змена ў суботу. Па вечарах і ў адзіны вольны дзень — нядзелю — грамадска-спартыўная і культурная праграма. Турніры па футболе, валейболе, баскетболе, сімвалічныя святы, экскурсіі па гістарычных мясцінах Беларусі. І ўсё гэта трэба паспець за два няпоўныя месяцы, пакуль доўжыцца змена ў студэнцкім атрадзе, што працуе на будоўлі аб'ектаў Беларускай атамнай электрастанцыі каля Астраўца.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

НА БУДОЎЛЮ — ПА КОНКУРСЕ

Усебеларуская маладзёжная будоўля (УМБ) на АЭС працуе ў Беларусі ўжо трэці год, кожны раз павялічваючы колькасць сваіх удзельнікаў. Летась тут адпрацавала больш за 400 студэнтаў: членаў грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» і маладзёжнай грамадскай агульнарасійскай арганізацыі «Расійскія студэнцкія атрады». Сёлета чакаецца, што іх будзе каля 800. Больш як 300 студэнтаў Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта ў 2016-м ужо прайшлі тут працоўную практыку. А ў ліпені на станцыі пачаўся трэці працоўны семестр, які лічыцца ў моладзі самым пачэсным.

У ім удзельнічаюць 428 чалавек з 18 беларускіх і 5 расійскіх атрадаў. Упершыню да студэнцкага руху Саюзнай дзяржавы далучыліся і сем студэнтаў з Казахстана.

СТАР. 2

■ На слыху

НАРАБІЛА БЯДЫ НЕПАГАДЗЬ

Вецер, больш падобны на тарнада, калечыў жывёлу і людзей

Надвор'е, што прыйшло ў Беларусь на пачатку гэтага тыдня, ужо ў панядзелак нанесла нямала шкоды. Як паведамляе прадпрыемства «Белэнерга», толькі 11 ліпеня без святла застаўся 301 населены пункт па ўсёй краіне. На стане на 9 гадзін раніцы 12 ліпеня без энергазабеспячэння заставаліся 29 населеных пунктаў. Асабліва цяжка прыйшлося паўночна-заходнім рэгіёнам Беларусі: шквалісты вецер і смерч выдзіраў з зямлі дрэвы, пераварочваў машыны і нават разбураў будынкі...

Эпіцэнтрам стыхіі стала Шаркаўшчына — над райцэнтрам пранёсся сапраўдны тарнада, шматлікія здымкі якога выкладвалі ў інтэрнэт відавочцы. Па аператыўнай інфармацыі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, у 16:30 на запасных пуцях чыгуначнай станцыі ў гарадскім пасёлку былі сарваны два казлавыя краны. Ад інцыдэнту ніхто не пацярпеў, затрымкі ў руху цягнікоў не было. У гэты ж час зусім непадалёк, у вёсцы Маркі Шаркаўшчынскага раёна абваліліся тры цялятнікі 1960 года пабудовы, якія належалі мясцовай малочна-таварнай ферме. Пацярпелыя — 35 гадавалых цялят. На аўтадарозе побач з пасёлкам гарадскога тыпу пераварнуўся грузавы аўтамабіль IVECO.

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Новым прэм'ер-міністрам Вялікабрытаніі стане Тэрэза Мэй

Тэрэза Мэй стане новым прэм'ер-міністрам Вялікабрытаніі, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на кіраўніка ўрада краіны Дэвіда Кэмерана. Зараз спадарыня Мэй узначальвае Міністэрства ўнутраных спраў Вялікабрытаніі. Дэвід Кэмеран заявіў пра свой намер сысці ў адстаўку пасля таго, як у Злучаным Каралеўстве прайшоў рэферэндум, на якім большасцю галасоў грамадзяне абралі выхад з Еўрапейскага саюза.

У Італіі сутыкнуліся пасажырскія цягнікі

На поўдні Італіі ў правінцыі Бары сутыкнуліся два пасажырскія цягнікі. Па звестках La Repubblica, у выніку аварыі загінулі чатыры чалавекі, дзесяць атрымалі траўмы. У той жа час ANSA паведамляе аб 10 ахвярах. Аварыя адбылася на ўчастку паміж гарадамі Рува-ды-Пулья і Карата. Па невядомай прычыне цягнікі апынуліся на адным пуці і сутыкнуліся на поўным хаду. На месца здарэння неўзабаве прыбылі медыкі, паліцыя і пажарныя. Па звестках паліцыі, загінула як мінімум пяць чалавек, а пажарныя паведамляюць пра дзесяць ахвяр. Удар быў вельмі моцным. Першыя вагоны цалкам пагнутыя. Выратавальнікам даводзілася разразаць пашкоджаныя карпусы, каб прабіцца да людзей.

Разведка Германіі праслухоўвала ўрады краін Еўрасаюза і НАТА

Германскі парламенцкі камітэт па кантролі за дзейнасцю спецслужбаў даў справаздачу аб маштабах сачэння ФРГ за кіраўніцтвам краін Еўрасаюза і НАТА. Паводле звестак ведамства, праслухоўцы падвяргаліся кіраўнікі дзяржаў і ўрадаў, міністры, а таксама іх асяроддзе. Асабліва інтэнсіўнае назіранне вялося за дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі дзяржаў ЕС і Паўночнаатлантычнага альянсу. Акрамя таго, праслухоўвалі арганізацыі, аб'екты няўрадавых арганізацый і бізнесу. Першапачаткова пасля выкрыццяў экс-агента ЦРУ Эдварда Сноўдэна стала вядома пра маштабы сачэння разведкі ЗША, якая шпіёніла за сотнямі тысяч грамадзян ФРГ. Ужо пасля высветлілася, што сачыць за аб'ектамі ў Еўропе амерыканцам дапамагала германская спецслужба.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Знойдзены спосаб пазбегнуць заўчаснай смерці

Даследчыкі з Гарвардскага ўніверсітэта высветлілі, што спажыванне ў вялікіх колькасцях ненасычаных тлушчаў, якія ўтрымліваюцца ў алеях, звязана з нізкай верагоднасцю ранняй смерці. У той жа час рацыён, які змяшчае вялікую колькасць жывёльных тлушчаў, наадварот, спрыяе пагаршэнню здароўя. Артыкул апублікаваны ў JAMA Internal Medicine. Дыетолагі высветлілі, што калі замяніць насычаныя тлушчы, якія ўтрымліваюцца ў сметанковым масле, сале і чырвоным мясе, ненасычанымі з аліўкавага, рапсавага і соевага алеяў, то можна пазбегнуць сур'ёзных праблем са здароўем. Аказалася, што розныя тыпы тлушчаў па-рознаму ўплывалі на стан арганізма. Транстлушчы (утрымліваюцца ў мясных і малочных прадуктах) апынуліся самымі шкоднымі: калі павялічыць іх спажыванне ўсяго на два працэнты, то рызыка заўчаснай смерці павысіцца на 16 працэнтаў. Пяціпрацэнтнае павелічэнне спажывання насычаных тлушчаў звязана з дадатковымі васьмю працэнтамі смерцяў. А вось ненасычаныя тлушчы аказваюць прама супрацьлеглы эфект. Узбагачаная імі дыета зніжала верагоднасць смерці на 11-19 працэнтаў.

КАРАТКА

Беларусь мае намер да 2020 года павялічыць даходы ад транзіту да $1,5 млрд, паведаміў міністр транспарту і камунікацый Анатоль Сівак на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў.

Адпаведна ўказу Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі Алена Спірыдовіч узнагароджана ордэнам Францыска Скарыны.

Памер месячнай мінімальнай заработнай платы (МЗП) за чэрвень бягучага года індэксуецца на 5,4%. Гэта абумоўлена тым, што індэкс спажывецкіх цэн за чэрвень перасягнуў пяціпрацэнтны парог да месяца яе ўстанаўлення (студзень 2016 года).

Энергазабеспячэнне, парушанае разгулам стыхіі, было адноўлена ў аўторак да 16.30 ва ўсіх населеных пунктах Беларусі, паведамілі ў «Белэнерга».

Шэсць беларускіх прадпрыемстваў адзначаны прэміямі СНД за дасягненні ў галіне якасці прадукцыі і паслуг.

ПАЙСЦІ І ВЯРНУЦЦА

Як не трапіць у спісы зніклых у лясах

За апошнія два тыдні на тэрыторыі толькі Мінскай вобласці людзі ў лясах губляліся чатыры разы. 27 чэрвеня а сёмай гадзіне вечара ад дзяжурнага па РУУС Пухавіцкага раёна паступіла паведамленне аб тым, што паблізу вёскі Талька ў лясным масіве згубіўся чалавек. Падчас высвятлення абставін стала вядома, што ў лесе заблудзіла 78-гадовая бабуля, якая пастаянна пражывае ў Мінску. На пошук старой рушылі супрацоўнікі РУУС, МНС і пошукава-выратавальны атрад «Анёл». Менавіта яго ўдзельнікі і адшукалі бабулю а чацвёртай гадзіне ночы...

Яшчэ тры выпадкі блукання ў лесе скончыліся менш драматычна. Паведамленні аб зніклых людзях паступалі ў Вілейскі і Лагойскі раённыя аддзелы па надзвычайных сітуацыях. Што прыкметна, усе званкі адбыліся ў прыцемках — ад 22 да 23 гадзін.

— А ў адным выпадку зніклы ў лесе патэлефанаваў самастойна, — расказвае **прэс-сакратар Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Крысціна БАРЭЙКА.** — Ён пайшоў у нетры а восьмай гадзіне вечара. Сітуацыя ўскладнялася тым, што чалавек заблудзіў у балоцістай мясцовасці. Але наступнай раніцай ён самастойна выйшаў з гушчару. Як, зрэшты, і ўсе іншыя блукальнікі.

СТАР. 6

ISSN 1990 - 763X

■ Выбары-2016

Ініцыятыўныя групы: рэгістрацыя скончана

Акруговыя выбарчыя камісіі Беларусі зарэгістравалі 446 ініцыятыўных груп па зборы подпісаў для вылучэння кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу шостага склікання, паведамляецца на сайце Цэнтральнай выбарчай камісіі.

Усяго ў акруговыя камісіі было пададзена 479 заяў аб рэгістрацыі груп, але ўхвалены былі не ўсе. На гэты момант больш за ўсё груп зарэгістравана ў Мінску — 114, менш за ўсё ў Віцебскай вобласці — 48. Прыём заявак скончыўся 7 ліпеня, іх разгляд працягваўся на працягу пяці наступных дзён.

Сярод вылучэнцаў, групы якіх зарэгістраваныя, 286 беспартыйных і 160 членаў палітычных партый. Больш за ўсё кандыдатаў у дэпутаты вылучаецца ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі — 39 чалавек. Ад партыі БНФ — 29, Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» — 23, Камуністычнай партыі Беларусі — 21, Ліберальна-дэмакратычнай партыі — 16, Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) — 16, Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці — 10, Беларускай партыі «Зялёныя» і Беларускай патрыятычнай партыі — па 3. Таксама на сайце ЦВК можна паглядзець папярэднія больш падрабязныя звесткі аб вылучэнцах ініцыятыўных груп.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

■ Слова — дэлегату Народнага сходу

Урокі патрыятызму

На V Усебеларускім народным сходзе начальнік Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь генерал-маёр Сяргей БОБРЫКАЎ прапанаваў удасканаліць дапрызыўную падрыхтоўку школьнікаў.

— Сяргей Валянцінавіч, чаму ўзнікла неабходнасць узняць гэтае пытанне на такім высокім узроўні?

— Мы даўно вывучаем сітуацыю. Бачым, якія да нас прыходзяць выпускнікі школ. Нас цікавіць, як яны падрыхтаваны да воінскай службы. Паглядзелі, што ёсць праблемы, і пачалі шукаць іх карані. Раней у школах былі выкладчыкі пачатковай ваеннай падрыхтоўкі. За імі значыліся свой кабінет, класнае кіраўніцтва, памяшканне для захоўвання зброі, цір. Гэтыя людзі прадметна займаліся падрыхтоўкай і юнакоў, і дзяўчат: адных — да ваеннай службы, іншых навучалі асновам медыцыны. Цяпер сітуацыя некалькі іншая. У Беларусі налічваецца больш як 2,5 тысячы школ, на якія прыпадае прыкладна 560 выкладчыкаў дапрызыўнай падрыхтоўкі. Гэта вельмі мала. І нават цэнтры дапрызыўнай падрыхтоўкі (9 у Мінску, адзін у Магілёве і 20 у Гомельскай вобласці) не вырашаюць гэтую праблему.

— І каб вырашыць гэтую праблему, вы прапануеце звярнуцца да мінулага вопыту. Нездарма кажуць: усё новае — добра забытае старое...

— Мы паглядзелі, якім чынам уводзілася пачатковая ваенная падрыхтоўка ў Савецкім Саюзе. Гэта пачыналася ў далёкім 1968 годзе. Было рашэнне ўрада, пастаўлены задачы перад Міністэрствам абароны, перад ДТСААФ, іншымі сілавымі ведамствамі. І пасля апрабавання гэтага пытання на пэўных школах і сярэдніх спецыяльных установах да 1972 года была выбудавана вельмі дакладная сістэма. Кіраўнік дзяржавы, выступаючы на сходзе, вельмі добра выказаўся наконт сістэмы адукацыі. Сапраўды, не трэба ламаць тое, што было зроблена раней. Мы вярнуліся да гэтага добрага вопыту і паглядзелі, што ў гэтым нічога дрэннага няма.

— Вы звяртаеце ўвагу на недастатковую колькасць спецыялістаў дапрызыўнай падрыхтоўкі. Як будзе вырашацца пытанне кадраў?

— Спецыяліст, які цяпер рыхтуе дзяцей да вайсковай службы, не зусім адпавядае тым патрабаванням, якія былі раней. У асноўным, гэта людзі не ваенныя. Больш за тое, каб дабраць патрэбныя да стаўкі гадзіны, яны вымушаны выкладаць працоўнае навучанне, асновы бяспекі жыццядзейнасці, фізічнае выхаванне... А мы хацелі б, аб чым і казалі на сходзе, каб яны займаліся менавіта пытаннямі дапрызыўнай падрыхтоўкі. І гэта здольная зрабіць вялікая колькасць афіцэраў запасу, якія падрыхтаваныя і скіраваныя на гэтую работу, чым раней і займаліся.

— А наколькі мэтазгодна сёння адводзіць частку навучальнага працэсу на дапрызыўную падрыхтоўку?

— Нам трэба займацца не толькі ваеннай падрыхтоўкай. Мы бачым, якія ёсць праблемы. Узяць хоць бы сітуацыю, калі падчас адпачынку ў расійскім лагеры загінулі падлеткі. Магчыма, каб яны мелі першасныя навыкі выратавання людзей на вадзе, умелі правільна аказваць медыцынскую дапамогу, трагедыі не адбылося б. Трэба, каб маладыя людзі былі падрыхтаванымі да любых сітуацый. У Гомелі, напрыклад, Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях створаны цэнтр па выжыванні ў экстрэмальных умовах. Але гэтага недастаткова. Мы хочам выйсці на дзяржаўную праграму грамадзянска-патрыятычнага выхавання.

— Пра патрыятычнае выхаванне даволі шмат гаварылася і на V Усебеларускім народным сходзе...

— Вялікіх праблем у гэтым плане ў нас, вядома, няма. Моладзь у нас нядрэнная. Яна проста іншая. Калі мы трапілі ў гэтую сур'ёзную дэмаграфічную яму, то перанакіравалі сваю работу на кадэцкія вучылішчы. Аб'ездзілі ўсе вучылішчы Беларусі і ўбачылі, што там вядзецца якасная мэтанакіраваная работа па падрыхтоўцы да паступлення не толькі ў Ваенную акадэмію, а і ў навучальныя ўстановы іншых сілавых структур. Безумоўна, вядзецца барацьба за абітурыента. Але мы адносімся да гэтага пытання па-дзяржаўнаму: калі выхаванец кадэцкага вучылішча аддасць перавагу іншаму сілавому ведамству — гэта добра. Усе мы — патрыёты сваёй Радзімы. І вельмі правільна адзначыў падчас сходу кіраўнік дзяржавы, што задачы па выхаванні патрыятызму стаяць зараз высока і такія словы, як суверэнітэт, тэрытарыяльная цэласнасць і незалежнасць — для нашай краіны вельмі важныя паняцці. Мы часам забываем, што ўжо шмат гадоў жывём без вайны. Можа, дзесьці мы не атрымліваем так шмат, як хацелася б. Але ў нас — мірнае неба, не ляцяць кулі над галавой і не гінуць людзі. Вось гэта важна. І ніяк не павінна стаяць далёка ад патрыятызму.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

СЮДЫ ТРАПЛЯЮЦЬ САМЫЯ ПАДРЫХТАВАНЫЯ

На адным з участкаў будаўніцтва АЭС.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Самая галоўная мэта працы моладзі на гэтым аб'екце — магчымасць уласнымі рукамі дакрануцца да нашай гісторыі. Сюды трапляюць самыя лепшыя і падрыхтаваныя. Большая частка будатрадаўцаў валодае спецыяльнымі навыкамі і вучыцца па адпаведных спецыяльнасцях накшталт атамнай энергетыкі і атамнага будаўніцтва, як, напрыклад, расійскія студэнты, — адзначыў Сяргей КЛІШЭВІЧ, другі сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ. — Каб трапіць на гэтую будоўлю, традыцыйна трэба адпавядаць умовам конкурсу. Падыходзіць па ўзросце (ад 18 гадоў), здароўі, актыўнай жыццёвай пазіцыі і, пажадана, мець будаўнічую спецыяльнасць не ніжэй за 2-3 разрад.

Яшчэ адно новаўвядзенне УМБ гэтага года — прысутнасць дзяўчат — на будоўлі будзе працаваць каля 20 юных прыгажунь. Летась была толькі адна студэнтка — на пасадзе камісара будоўлі. Найбольш запатрабаваныя сёлета прафесіі на АЭС сярод моладзі — муляр, бетоншчык, арматуршчык, маляр.

МАЛА СПЯЦЬ І ШМАТ ПРАЦУЮЦЬ

Працоўны дзень моладзі пачынаецца а сёмай гадзіне раніцы. Дахаты, у інтэрнат кватэрнага тыпу, у які часова ператварыўся звычайны жылы будынак у Астраўцы, і да месца працы (больш як 20 кіламетраў ад горада) студэнтаў прывозяць.

Штодзень ім забяспечаны бясплатныя абеды ў сталовай АЭС. Астатняе харчаванне — за свой кошт.

Перад урачыстай цырымоніяй адкрыцця трэцяга семестра, на які запрасілі журналістаў, пытаюся ў хлопцаў, як ім жывецца. Працуюць яны ўжо тыдзень і паціху наладжваюць быт.

«Нас не бывае дома мінімум па 14 гадзін. Мала спім і шмат працуем, але задаволены, што трапілі сюды. У любым атрадзе галоўнае не сон, а дух. Тым больш зручна, што ўсе жывём побач. Так працей і адпачываць, і да мерапрыемстваў рыхтавацца. На гэтым тыдні, напрыклад, пачынаецца спаборніцтва за кубак па футболе», — адказвалі студэнты. І відаць было, што яны па-сапраўднаму зацікаўлены ўсім, што адбываецца на будоўлі і па-за яе межамі.

Праца на УМБ залічваецца студэнтам як стаж. З кожным з іх заключаны тэрміновы працоўны або грамадзянска-прававы дагавор. А ў суботні дзень заробак налічваецца па двайным тарыфе. Летась, кажуць студэнты, за семестр многія атрымалі каля 18 млн на старыя грошы. Выніковыя лічбы ў кожнага залежаць ад аб'ёмаў выкананай работы.

СПЕЦЫЯЛІСТЫ З ДЫПЛОМАМ І СТАЖАМ

На ўручэнні атрадам працоўных пуцёвак і сімвалічных касак пачэсныя госці падкрэслівалі, што на АЭС ад моладзі патрабуюць якасці і дысцыпліны. Аднак разам з тым такі вопыт стане для іх бадай што самым паўнаважным, бо менавіта тут на практыцы яны змогуць засвоіць тое, з чым не сутыкнуцца ў найлепшых тэарэтычных выкладках.

Студэнты Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Максім ПРАФАЦІЕЎ і Аляксандр ЛАРЧАНКА.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Атмасферу, што пануе на будоўлі, добра акрэсліў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір ДЗЯШКО.**

— Студатрад — бясцэнны вопыт работы ў камандзе, узаемавыручкі і падтрымкі. Працуючы на гэтай пляцоўцы, вы атрымаеце добры зачын на ўсё жыццё, і захаваеце ў памяці бяссонныя астравецкія ночы з гітарай, сяброў і, магчыма, першае каханне.

— Вельмі важна, што кожны год на пляцоўцы моладзь аб'ядноўваецца, каб будаваць не толькі будучыню, але і добрыя цёплыя адносіны. Студэнты атрымліваюць каласальны вопыт практычных ведаў і работы ў калектыве — а гэта і ёсць працяг традыцый студатрадаўскага руху яшчэ тых савецкіх часоў, — дадаў **першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Андрэй БЕЛЯКОЎ.**

Самі студэнты таксама добра разумеюць выгады, што нясе ім практыка на УМБ.

— Я, як і кожны, хто пабываў на гэтай будоўлі, цяпер маю цудоўнае ўяўленне, што такое атамная станцыя. Трапіць на практыку на АЭС, якая працуе, амаль нерэальна. Тым больш апынуцца ў тэрмабалонцы і ўбачыць абсталяванне першага контуру. А тут можна ўсё не толькі разгледзець ужывую, а і памацаць, убачыць, як і дзе што зманціравана і падключана, як усё будуецца і функцыянуе, — падзяліўся Раман КАПЫЛОЎ, куратар працы расійскіх атрадаў. — Пасля ўніверсітэта я выйду ўжо не толькі з дыпломам, але і з вопытам практычнай работы на атамнай станцыі і стажам.

Некаторыя студэнты ўжо цяпер спадзяюцца, што гэтая АЭС стане іх будучым месцам працы. Прычым прыехаць на астравецкую зямлю згодная не толькі айчынная моладзь.

Мікіта Фадзееў, камандзір атрада «Прайд» імя М. Акцябрскай Нацыянальнага даследчага Томскага політэхнічнага ўніверсітэта вучыцца на кафедры атамных электрастанцый. Ён і яшчэ шасцёра ўраджэнцаў Казахстана, што летам далучыліся да будоўлі на Беларускай АЭС, марылі трапіць у Беларусь яшчэ з 2014 года:

— Працаваць тут цяжка, але цікава. Пакуль у нас няма вышэйшай адукацыі, дапускаюць да больш сур'ёзнай працы толькі па электрамантажных і бетонных работах. Мы бетануем перакрыцці і робім падлогавае пакрыццё. Я прыехаў не толькі папрацаваць і набрацца вопыту, але і паглядзець, як і што ўстроена ў Беларусі і Астраўцы, якія тут людзі. Пакуль толькі станоўчыя эмоцыі. Магчыма, калі прапануюць, то і на пастаянную працу да вас перааеду.

Яўгенія Агібалава, камісар УМБ, сустракае на Беларускай АЭС сваю пятую практыку. Летась дзяўчына была камісарам на будоўлі ў Новаваронежы. Яўгенія атрымлівае другую вышэйшую адукацыю, педагагічную. Па першай яна фінансіст, і ўпершыню выехала за межы Расіі.

— Для мяне гэта цудоўны шанц атрымаць грандыёзны вопыт міжнароднай работы са студэнтамі. Я адказваю за арганізацыю ўсіх непрацоўных мерапрыемстваў на будоўлі. Акрамя культурнай праграмы, гэта яшчэ і штотыднёвыя лінейкі, дзе ўзнагароджваюцца пераможцы конкурсаў, адзначаюцца лепшыя байцы тыдня, падводзяцца прамежкавыя вынікі працы.

У СЭРЦЫ АТАМНАЙ СТАНЦЫІ

Пасля ўрачыстай цырымоніі адкрыцця працоўнага семестра журналісты змаглі крыху павандраваць па будоўлі і паглядзець, дзе працуюць студэнты. У цэху №1 рэжуць і вяжуць арматуру для будучых металаканструкцый. Студэнты тут, як і паўсюдна на будоўлі, працуюць побач са штатнымі супрацоўнікамі і пад іх пільным наглядам.

Дзмітрый ЧАРАНКОЎ, баец атрада «Барс» з Обнінска працуе на Беларускай АЭС ужо другі год. У мінулым годзе хлопцы працавалі на 1-ым і 2-ім энергаблоках. Наразалі арматуру на пліты перакрыцця, манціравалі ўнутраную ахоўную абалонку энергаблока:

— Цяпер мы рыхтуем арматуру для 1-га і 2-га блокаў: наразаем разьбу, згінаем. Адказнасць высокая, але побач заўжды спецыялісты, якія падкажуць. Я вучуся на эксплуататара атамных электрастанцый, таму, калі атрымаецца, буду тут працаваць.

Яшчэ адзін аб'ект, куды наведаліся журналісты, — сталовая. Тут на другім паверсе заліваюць сцяжку на падлозе байцы атрада «Эўрыка» Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Менавіта полацкія студэнты летась сталі лепшым атрадам будоўлі па колькасці напрацаваных гадзін і актыўным удзеле ў культурным і спартыўным жыцці.

Цімур МІРЗАЕЎ, баец атрада «Эўрыка», студэнт 5 курса інжынерна-будаўнічага факультэта па спецыяльнасці прамыслова-грамадзянскае будаўніцтва таксама марыць трапіць на работу на АЭС па размеркаванні.

Пабывалі мы і ў самым сэрцы будучай станцыі — на будоўлі тэрмаабалонкі, дзе будзе знаходзіцца абсталяванне першага контуру: атамны рэактар, парагенератар, галоўныя цыркуляцыйныя насосы.

— 26 метраў уніз-наверх штодня — гэта добрая зарадка перад работай, вельмі бадзёрыць, — кажа Мікіта Фадзееў, які тут працуе. — А да вышыні хутка прывыкаеш.

Пэўна што так, але асабіста ў мяне дрыжыкі па целе былі ад такой вышыні ды абсягу навокал. Аднак атрыманыя ад наведвання АЭС эмоцыі вартыя такіх перажыванняў.

Маладзёжная змена на станцыі скончыцца 26 жніўня.

Ірына СІДАРОК.

НАРАБІЛА БЯДЫ НЕПАГАДЗЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На жаль, не абышлося ў Шаркаўшчыне і без пацярпелых сярод людзей. З траўмамі рознай ступені цяжкасці, атрыманымі на тэрыторыі прыватных дамоў, шпіталізаваны грамадзянкі. На вуліцы Маладзёжнай вецер перавярнуў цэлы гандлёвы павільён, які належаў мясцовай індывідуальнай прадпрымальніцы. У выніку прадаўшчыца атрымала рэзаныя раны абодвух перадпляччаў і пералом шыйкі бядра. Жанчыну даставілі ў бальніцу для аказання дапамогі.

Былі праблемы і ў іншых рэгіёнах. У Скідзелі без электраэнергіі амаль на гадзіну застаўся мясцовы хлебазавод. Усяго, як паведамляюць у прэс-службе МНС, ад стыхіі пацярпелі Гродна і сем населеных пунктаў Гродзенскай і Віцебскай абласцей. Лік пашкоджаных будынкаў ідзе на дзясяткі: 26 жылых дамоў, адзін аб'ект сацкультбыту, адна вытворчая і тры сельскагаспадарчыя пабудовы. Вецер паваліў паўсотні дрэў, у выніку чаго былі пашкоджаны дзве легкавыя машыны.

Нямала шкоды прынесла і маланка. Толькі ў Гродзенскай вобласці ад удараў бліскавіцы загарэліся тры пабудовы: адміністрацыйны будынак свінагадоўчага комплексу ў вёсцы Фарны Канец Шчучынскага раёна, а таксама гаспадарчыя пабудовы ў Гальшанах Ашмянскага раёна і вёсцы Балічы таксама пад Шчучынам.

Як паведамляюць сіноптыкі, надвор'е ў Беларусі працягне заставацца нестабільным. Пры дастаткова высокай тэмпературы (у паўднёвых раёнах да 36 градусаў) па ўсёй тэрыторыі краіны на працягу тыдня чакаюцца дажджы і навальніцы з парывамі ветру да 15—20 метраў за секунду. Таму цалкам верагодна, што непагадзь яшчэ паспее нашкодзіць.

Разбураны гандлёвы павільён у Шаркаўшчыне.

Фота карыстальніка Instagram vickycat4.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ВАС ЗАСПЕЛА НАВАЛЬНІЦА?

Парады ад МНС

- Найбольшую небяспеку для чалавека падчас навальніцы ўяўляе маланка. Таму ў непагадзь не варта знаходзіцца паблізу ад жалезабетоннага палатна, вадаёмаў, высокіх аб'ектаў без маланкаадвода. Нельга дакранацца да ствалоў дрэў, металічных канструкцый. Непажадана знаходзіцца побач з уключанымі электрапрыборамі, праводкай, металічнымі прадметамі.
- Калі непагадзь заспела вас дома, адключыце ад сілкавання ўсе электрапрыборы, выцягніце з тэлевізара штэкер знешняй антэны, спыніце тэлефонныя размовы. Зачыніце дзверы і дымаходы. Не знаходзьцеся каля акна, печы, коміна, масіўных металічных прадметаў, на даху і на гарышчы.
- Знаходзячыся на вуліцы, пакіньце адкрытую прастору і схавайцеся ў любым будынку ці пад'ездзе. Не дакранайцеся да сцен пабудовы, калі ўкрываецеся пад «казырком». Не карыстайцеся мабільным тэлефонам (лепш яго выключыць). Не стойце побач са слупамі і рэкламнымі шчытамі.
- Машыну падчас навальніцы варта спыніць і перачакаць разгул стыхіі ў салоне. Трэба зачыніць вокны, апусціць антэну і заглушыць рухавік. Не варта браць у рукі мабільны тэлефон, кранаць металічныя прадметы, ручкі дзвярэй.
- У лесе пажадана трымацца далей ад адзіночных высокіх дрэў, нельга знаходзіцца каля вогнішча, бо цёплае паветра лепш праводзіць ток. Схавацца можна пад нізкарослымі дрэвамі з густымі кронамі. Варта звярнуць увагу на наваколле — калі бачыце недалёка расшчэпленыя маланкай дрэвы, змяніце месца, бо гэта паказчык добрай электраправоднасці грунту.
- На адкрытай мясцовасці трэба сысці ад ліній электрапередачы і правадоў. Схавацца можна ў лагчыне ці рове. Калі нізін побач няма, можна прыгнуцца да зямлі ці нават легчы на яе. Нельга хавацца каля стагоў сена, у адзіночных бараках ці хлявах. Нельга хадзіць басанож і падымаць над галавой прадметы з высокай электраправоднасцю: лапаты, матыкі, косы.
- Тэрыторыю вадаёма падчас навальніцы варта пакінуць, знайсці сховішча трэба на беразе. Калі гэта немагчыма, асушыце лодку, пры наяўнасці тэнта падыміце яго. Апраніце на сябе сухое, сядзьце далей ад мачтаў і падкладзіце пад сябе гумавыя боты ці ратавальную камізэльку. Рыбалку варта спыніць, бо снасці могуць праводзіць ток.

ЗАБАРАНІЦЬ НЕЛЬГА ПРАДАВАЦЬ

ЦІ ЁСЦЬ ЭФЕКТ АД ЗАБАРОНЫ РЭАЛІЗАЦЫІ АЛКАГОЛЮ

Праблема алкагалізацыі для нас не новая. Яна актуальная, па вялікім рахунку, у меншай ці большай ступені для кожнага горада, мястэчка краіны. Сталіца, зразумела, выключэннем не з'яўляецца. У тым жа трактаразаводскім пасёлку, што прымыкае да МТЗ, супрацоўнікі міліцыі штодня складаюць пратаколы ў дачыненні амататараў кульнуць кілішак на свежым паветры. Зразумела, цалкам перамагчы падобную схільнасць некаторых асоб складана, але актыўная дзейнасць міліцыі плён усё ж такі прыносіць.

— Трактаразаводскі пасёлак — адзін з самых праблемных раёнаў горада. Ледзь не ў кожным пад'ездзе жыве былы асуджаны, — кажа **Дзмітрый ЛАНЕЦ, старшы ўчастковы інспектар УУС адміністрацыі Партызанскага раёна сталіцы.** — Сучасны Мінск калісьці пачынаўся менавіта з нашага раёна. Трактарны завод стаяў наводшыбе, за ім — лес. І ўсе рабочыя завода атрымлівалі жыллё тут. Працоўны клас і зараз пераважае ў насельніцтве мікрараёна. А што многія рабочыя робяць пасля змены? Збіраюцца каля чыгункі, на зялёнай зоне, хуценька выпіваюць, закусваюць сняданкам, які прыхапілі з сабой, і разыходзяцца. Зімой п'юць менш, вясной пачынаецца ўсплёск. Узнікае ўражанне, што многія з ланцуга сарваліся. Усіх насамрэч не пакараеш. Гэта зойме столькі часу, што пратаколаў не хопіць. Тым не менш мы актыўна працуем у гэтым кірунку. Прыпаўторным правапарушэнні чалавек аўтаматычна ставіцца на прафілактычны ўлік. З ім праводзяць цэлы комплекс мерапрыемстваў. Калі і гэтая мера на яго не паўплывала, а ён зноў здзейсніў правапарушэнне ў стане алкагольнага ап'янення, на разгляд ставіцца пытанне аб прымусовым накіраванні ў лячэбна-працоўны прафілакторый.

— Усіх падапечных, напэўна, ужо добра ведаеце.

— Я помню толькі некалькі чалавек, якія вярнуліся з ЛПП і адмовіліся ад спіртнога, ствараюць сем'і. Збольшага ўсе працягваюць піць. Толькі тэрмін у кожнага розны. Нехта вяртаецца да алкаголю праз месяц, а хтосьці церпіць год, два.

— Алкагалізм становіцца прычынай многіх злачынстваў?

— Так. Усё пачынаецца з алкаголю. Калі чалавек думае, здзяйсняць ці не здзяйсняць злачынства, у стане алкагольнага ап'янення аб гэтым ён нават не задумваецца. Тычыцца гэта не толькі сталых жыхароў, але і моладзі. Аднаму толькі-толькі васямнаццаць споўнілася, а ён ужо ў ЛПП паехаў. Лічу, што ўсё пачынаецца з сям'і. Усе мы назіраем за тым, як жывуць нашы бацькі, бяром з іх прыклад. І калі хлопец бачыць, як ягоны тата пастаянна выпівае, напэўна, таксама думае, што гэта нармальна. Дзеці пачынаюць выпіваць нават з падлеткавага ўзросту, ставяцца на ўлік у інспекцыі па справах непаўналетніх. А ёсць прыклады, калі людзі п'юць цэлымі сем'ямі. Я іх кланамі адпраўляю у турмы і ЛПП.

— Ведаю, што пасля адной з такіх п'янак пазалетась, зімой на бульвары Трактарабудаўнікоў забілі хлопца...

— Было такое. Выпівалі якраз рабочыя завода. Паміж імі ўзнік канфлікт. Адзін з удзельнікаў меў пры сабе сцізорык, якім і прычыніў цялесныя пашкоджанні. Аднак, пастукаем па дрэве, забойствы ў нас — вялікая рэдкасць. Найчасцей правапарушальнікі б'юцца падчас сямейных скандалаў, крадуць нешта. Часта ўладальнікі аўтамабіляў самі гэтаму садзейнічаюць, калі навідавоку пакідаюць відэарэгістратар ці магнітолу.

— Ці часта атрымліваецца раскрываць злачынствы па гарачых слядах?

— Такіх выпадкаў шмат. Калі чалавек паведаміў аб знікненні маёмасці адразу, а не праз дзень, верагоднасць знайсці злачынца ёсць. Ну і, безумоўна, вельмі важна, каб ён не паспеў збыць украдзенае.

— Закрыццё кругласутачнага кіёска з фаст-фудам каля метро дапамагло вам у працы?

— Безумоўна. Да яго людзі спецыяльна прыязджалі па спіртное на таксі. Калі адміністрацыя раёна ў некаторыя дні забараняла продаж алкаголю ў крамах, яго ў кіёску прадавалі пастаянна. На гэтым пятаку здаралася панажоўшчына, бойкі. Людзі не маглі нават падзяліць чаргу. А зачынілі яго з-за хадайніцтва раённага ўпраўлення ўнутраных спраў. Усё было матывавана менавіта распіццём спіртных напояў.

— Самагон у хатніх умовах не гоняць?

— Не, але я ведаю кватэры, дзе па начах прадаюць спіртное. Гэтыя адрасы мы ўжо неаднаразова адпрацоўвалі.

— За дзесяць гадоў працы ў Трактаразаводскім пасёлку вы назапасілі пэўны вопыт і, напэўна, ведаеце, як трэба змагацца з алкагалізацыяй грамадства.

— Гэта вельмі цяжка. Паўтаруся, усё пачынаецца з сям'і. Але нормы па забароне продажу алкаголю ў некаторыя дні нам, безумоўна, дапамагаюць. У такія часы адміністрацыйных правапарушэнняў, злачынстваў становіцца менш. Мы таксама праводзім выязныя судовыя пасяджэнні ў актавых залах трактарнага, маторнага заводаў. Усё гэта робіцца дзеля таго, каб людзі бачылі, што падобныя рэчы абвяшчаюцца. За гэта можна патрапіць у ЛПП.

Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*

■ Геапалітыка

НА СЛОВАХ І ПА ФАКЦЕ



Несумненна, што галоўнай геапалітычнай падзеяй мінулага тыдня быў **саміт НАТА,** які прайшоў у Варшаве. Найбольшую цікавасць уяўляла пазіцыя ЗША, чый лідар прысутнічаў на саміце. У артыкуле, апублікаваным у газеце Financial Times, тэрміновымі выклікамі для НАТА Барак Абама назваў тэрарыстычную групоўку Ісламская дзяржава, Расію, а таксама канфлікты ў Афрыцы, на Блізкім Усходзе і Brexit. Самым сур'ёзным наступствам саміту для Беларусі стала зацвярджэнне папярэдне адобранага рашэння, у адпаведнасці з якім у Польшчу, Літву, Латвію і Эстонію дашлюць па батальёне для ўзмацнення сіл НАТА на ўсходнім напрамку. У складзе кожнага батальёна будзе да тысячы ваеннаслужачых, фарміравацца яны будуць галоўным чынам за кошт кадраў з ЗША, Вялікабрытаніі, Германіі і Канады. Узмацненне НАТА на межах Беларусі і Расіі суправаджалася традыцыйнай рыторыкай пра нежаданне рэалізацыі сцэнарыя халоднай вайны і гонкі ўзбраенняў, але па факце з'яўляецца элементам новай халоднай вайны, якая ўжо вядзецца. Хоць, як адзначыў беларускі міністр замежных спраў, Беларусь не будзе разглядаць такое размяшчэнне як прамую пагрозу для нашай бяспекі, наша краіна не можа адобрыць падобнае рашэнне. Уладзімір Макей заклікаў да прамога і шчырага дыялогу паміж усімі зацікаўленымі бакамі, каб зняць недавер і своечасова адрэагаваць на нейкія непрадбачаныя негатыўныя сітуацыі, звязаныя з пытаннямі бяспекі.

Цікава адзначыць, што падчас саміту прэзідэнт ЗША правёў перамовы з польскім прэзідэнтам, па выніках якіх на прэс-канферэнцыі выказаў крытыку з нагоды нядаўніх змяненняў у польскім заканадаўстве, якія тычацца абмежавання паўнамоцтваў Канстытуцыйнага суда. На думку Абамы, ад прынятых крокаў трэба адмовіцца. Польскі прэзідэнт ніяк не пракаментаваў крытыку з боку лідара ЗША.

КНДР працягвае, насуперак санкцыям з боку сусветнай супольнасці, развіваць свае магчымасці па дастаўцы боегаловак на вялікія адлегласці з дапамогай балістычных ракет. 9 ліпеня быў ажыццёўлены **пуск ракеты з падводнай лодкі,** які завяршыўся няўдала. Папярэдні запуск балістычнай ракеты з падводнай лодкі быў ажыццёўлены 24 красавіка і таксама скончыўся няўдачай. Акрамя гэтага, пастаянна праводзяцца запускі балістычных ракет наземнага базіравання. Усё гэта служыць для ЗША добрым апраўданнем, каб узмацняць сваю ваенную прысутнасць у рэгіёне, накіраваную галоўным чынам не супраць КНДР, а супраць Кітая. У прыватнасці, на мінулым тыдні было ўзгоднена рашэнне аб размяшчэнні ў 2017 годзе на тэрыторыі Паўднёвай Карэі амерыканскай сістэмы супрацьракетнай абароны, што ўключае ў сябе радар, з дапамогай якога можна адсочваць практычна ўсю тэрыторыю Кітая.

На тэрыторыі ЗША прайшоў новы **маштабны тэракт у Даласе.** У ходзе пратэстаў супраць жорсткіх дзеянняў амерыканскай паліцыі ў адносінах афраамерыканцаў у папярэднія тыдні, адзін з дэманстрантаў адкрыў агонь па паліцэйскіх. Забіта пяць, паранена шэсць афіцэраў паліцыі. Тэрарыст-афраамерыканец, які аказаўся былым удзельнікам ваенных дзеянняў у Афганістане, быў ліквідаваны бомбай, дастаўленай робатам на падземную паркоўку, дзе ён хаваўся. Тэракт выклікаў такі рэзананс у СМІ ЗША, што амерыканскі прэзідэнт прыняў рашэнне скараціць сваю еўрапейскую паездку на адзін дзень, каб раней вярнуцца ў ЗША.

Тэрарыстычная групоўка Ісламская дзяржава пераживае нялёгкія часы. Тэрыторыя пад яе кантролем няўхільна скарачаецца, прыток новых членаў арганізацыі рэзка запаволіўся, усё большы негатыўны ўплыў на фінансы групоўкі аказваюць шматлікія меры, якія прымаюцца па ўсім свеце супраць спонсараў, і антытэрарыстычныя аперацыі на акупаванай тэрыторыі Сірыі і Ірака. Пачашчаюцца выпадкі дэзерцірства з поля бою, што прымушае арганізацыю прымаць новыя меры дзеля спынення гэтай тэндэнцыі. У прыватнасці, на мінулым тыдні сем дэзерціраў былі зажыва звараныя.

Прэзідэнцкая кампанія ў ЗША набірае абароты. Тым часам робяцца ўсё новыя і новыя спробы скампраметаваць вядучых кандыдатаў гонкі за пасаду прэзідэнта — Хілары Клінтан і Дональда Трампа. Так, пятага ліпеня Дональд Трамп быў абвінавачаны ў антысемітызме, на падставе фатаграфіі ў Twitter, на якой была намаляваная шасціканцовая зорка. Каманда Трампа зрабіла ход у адказ — **зяць кандыдата ў прэзідэнты** Джарэд Кушнер апублікаваў артыкул, у якім расказаў, што **з'яўляецца нашчадкам яўрэяў з Беларусі,** якія цудам выжылі падчас нацысцкага генацыду. Збегшы з гета ў Навагрудку, яго бабуля ўступіла ў атрад партызан Бельскіх, дзе і пазнаёмілася з яго дзедам.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе з прычыны смерці ЦЕЛЕША Уладзіміра Міхайлавіча, намесніка дырэктара выдавецкага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Народная асвета», і выказвае спачуванні родным і блізкім нябожчыка.

РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» смуткуе ў сувязі са смерцю ЦЕЛЕША Уладзіміра Міхайлавіча, намесніка дырэктара выдавецкага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Народная асвета», і выказвае глыбокія спачуванні родным і блізкім нябожчыка.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

13 ліпеня 2016 г. № 12 (375)

ЭКАФЕСТЫВАЛЬ

ЗЯЛЁНАЯ ЭКАНОМІКА

як беларускі культурны код

У Навагрудку адбыўся экафестываль «Зялёная эканоміка як беларускі культурны код», арганізаваны раённым выканаўчым камітэтам і прадстаўніцтвам Еўрапейскага саюза ў нашай краіне.

Галоўнай падзеяй свята стала адкрыццё ў горадзе сартавальнай лініі цвёрдых бытавых адходаў. Яна дазволіць значна знізіць нагрузку на экалогію раёна, а мясцовая камунальная служба зможа не толькі ўтылізаваць смецце на сучасным узроўні, але і атрымліваць ад гэтага эканамічную выгаду.

Аб уводзе такога аб'екта паклапаціліся Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, Навагрудскі райвыканкам і праект «Падтрымка рэгіянальнага і мясцовага развіцця», які фінансуецца Еўрапейскім саюзам. За сродкі ЕС (795 935 еўра) сартавальную лінію аснасцілі сучасным абсталяваннем — кантэйнерамі для адходаў, смеццявозамі, прэсам, пагрузчыкам. А беларускі бок выдаткаваў 6,5 мільярда рублёў на праектныя, мантажна-будаўнічыя работы і частку абсталявання.

На цэнтральнай плошчы Навагрудка свае шатры разгарнулі 8 «зялёных» праектаў, якія ажыццяўляюцца ў розных рэгіёнах Беларусі пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага саюза. Удзельнікі фестывалю гулялі ў энергаэфектыўныя віктарыны, з дапамогай «анлайн-калькулятараў» вучыліся эканоміць на паслугах ЖКГ, знаёміліся з будовай сонечных батарэй і электрабайкаў. Дарэчы, сёлета гэта ўжо другое гарадское свята ў рэспубліцы пад слоганам «Зялёная эканоміка як беларускі культурны код» — першае адбылося ў Полацку. Мяркуецца, што на працягу лета мабільны дэсант «зялёных» праектаў пабывае і ў іншых гарадах краіны.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
prakopchik@zviazda.by

Фота прадастаўлена агенцтвам EZERIN.COM.

Сартавальную лінію цвёрдых бытавых адходаў у Навагрудку аснасцілі сучасным абсталяваннем.

У тэму

На фестывалі ў Навагрудку праекты Праграмы развіцця ААН «Зялёная эканоміка» і «Энергаэфектыўнасць у школах» прадставілі дзве інтэрактыўныя гульні, якія папулярызуюць ідэі энергаэфектыўнасці, рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, адказнага стаўлення да навакольнага асяроддзя. Гульня «Зялёная эканоміка» (для мабільных тэлефонаў і планшэтаў) знаёміць з «зялёнай» энергетыкай, экатурызмам, правільным абыходжаннем з адходамі, «зялёным» транспартам. А настольная гульня «Энергаполіс» прапануе прыгодніцкую прагулку з прадстаўленнем практычна ўсіх сучасных «зялёных» тэхналогій. Пасля праходжання гульні ўдзельнікі атрымаюць уяўленне, як можа і павінен выглядаць «зялёны» горад будучыні.

СВЯТЛО Ў АКНЕ

БУСЕЛ ЗАТРЫМАЎСЯ Ў ДРЫБІНЕ

У раёне знайшлі сакрэт дзейснай прафілактыкі сямейных праблем і павышэння нараджальнасці

Дапамагаць сем'ям — звычайная справа для Ларысы Арцёменкі.

Пазалетась гэты раён заявіў пра сябе ў рэспубліцы як рэкардсмен па нараджальнасці. Сёлетні паказчык за 5 месяцаў таксама высокі — больш за 14 немаўлят на 1000 жыхароў.
Не апошнюю ролю ў паляпшэнні дэмаграфічнага становішча адыграў пілотны праект «Сям'я для дзіцяці», які тут рэалізоўваўся з 2012 года.

Апошнія 5 гадоў у раёне не было ніводнага выпадку пазбаўлення бацькоўскіх правоў. Нават прыйшлося закрыць раённы сацыяльны прытулак, бо там не засталося ніводнага дзіцяці. А будынак, дзе ён знаходзіўся, плануецца прыстасаваць пад дзіцячы дом сямейнага тыпу. Ужо і кандыдатуры бацькоў падшукваюцца. Гэты дзіцячы дом стане трэцім у раёне, два папярэднія існуюць у Дрыбіне і Трылесіне.

Хуткая дапамога для сям'і

— Дзеці павінны выхоўвацца ў біялагічнай сям'і, а гэта значыць, трэба папярэджваць тыя фактары, якія негатыўна ўплываюць на яе дабрабыт: выкараняць выпадкі злоўжывання спіртнымі напоямі, садзейнічаць у працаўладкаванні і рашэнні жыллёвых праблем, аказваць сацыяльную дапамогу, у тым ліку адрасную. Мы прааналізавалі абстаноўку і прыйшлі да высновы, што да пазбаўлення бацькоўскіх правоў прыводзіць позна пачатая праца з сям'ёй. Цяпер усе нашы службы задзейнічаны ў прафілактыцы, — кажа **намеснік старшыні Дрыбінскага райвыканкама па сацыяльных пытаннях Дзмітрый ПІМАШЭНКА.**

Уладзімір Атрахімёнак ратуе не толькі ад пажараў, але і ад абыякавасці

Разам з **Ларысай АРЦЁМЕНКАЙ, дырэктарам Дрыбінскага сацыяльна-педагагічнага цэнтра,** ідзём у госці да сям'і, якая стала на шлях выпраўлення. Маладыя з ліку тых, што пажаніліся амаль што дзецьмі — адразу ж пасля школы. Але жыццё разам — гэта не толькі рамантыка. Са з'яўленнем дзіцяці з'явіліся і праблемы, якія маглі прывесці да распаду сям'і. Але своечасова ўмяшаліся адпаведныя службы, і цяпер маладыя разам, а іх саюз замацавала яшчэ адно дзіця.

Першае, што кідаецца ў вочы, калі заходзім у інтэрнат, дзе жыве сям'я, — цэлая батарэя дзіцячых калясак. Нас сустракае сімпатычная жанчына з дзіцем на руках. Старэйшая дачка на занятках, муж на працы. Пакойчык невялікі, але ўтульны. Відаць, што жанчына клапатлівая. Пра складаны перыяд жыцця прыгадваць не хочацца, таму размаўляем толькі пра станоўчае.

— Выйшла замуж, нарадзіла Віку. Якраз на Дзень Перамогі. Таму імя выбрала сябе само — Вікторыя! А сынульку нашага Кірылам завуць, як Патрыярха ўсяе Русі, — усміхаецца Святлана.

На сценах пакоя — фотаздымкі дзяцей і дыпломы ў рамках. Жанчына з гонарам паказвае на адзін з іх, дзе Віку адзначылі за дасягненні ў спорце. Відаць, што для сям'і гэтыя поспехі не пусты гук. Як і сам статус — сям'я. Раней, калі муж ездзіў на заробкі ў Расію, маладая жонка цяжка перажывала расстанне. Цяпер яны разам, і гэта зусім іншая справа.

Пасля сустрэчы з гэтай жанчынай пачынаеш верыць не толькі ў вялікую сілу кахання (бо, калі б яго не было, нічога б не выратавала сям'ю), але і перавыхавання (Ларыса Арцёменка і яе калегі паўплывалі на лёс не адной такой пары).

Паспець працягнуць руку

Наогул, работа ў супрацоўнікаў сацыяльна-педагагічнага цэнтра не кабінетная. Дайшла інфармацыя, што дзесьці загулялі, запілі, паскандалілі — гэта ўжо нагода для дзеяння. Нельга пускаць справу на самацёк.

— Наш каардынатар у рабоце — камісія па справах непаўналетніх, — кажа Ларыса Арцёменка. — Калі паступіў сігнал, усе службы прыходзяць у «баявую гатоўнасць». Мы падтрымліваем сувязі са старастамі вёсак, старшынямі сельвыканкамаў. Калі ў вёсцы нешта адбылося, навіна хутка распаўсюджваецца і даходзіць да нас.

Пакутуюць ад легкадумных бацькоў перш за ўсё дзеці. Меры ўздзеяння на праблемных дарослых — ад прапановы закадзіравацца да кантролю на працоўным месцы. Спіс падналядных сем'яў штомесячна абнаўляецца. Кагосьці здымаюць з кантролю, кагосьці, наадварот, ставяць.

Наталля — маці-адзіночка, пачала прыкладвацца да бутэлькі і забываць пра сваю трохгадовую дачку. Кіне дома адну, а дзверы — на ключ. Скончылася тым, што недарэчную маці паставілі на ўлік як сацыяльна небяспечную.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

У Дрыбіне зрабілі ўсё, каб захаваць гэтую прыгожую пару.

ТЭМА ДНЯ

ЗАТРАТЫ РЭАЛЬНЫЯ І... ЗАВЫШАНЫЯ

Як выконваюцца даручэнні кіраўніка дзяржавы па зніжэнні сабекошту жыллёва-камунальных паслуг?

Прадпрыемствы ЖКГ вобласці недастаткова працуюць па эканоміі паліўна-энергетычных, матэрыяльных і працоўных рэсурсаў, зніжэнні затрат. Па-ранейшаму не абыходзіцца без завышэння сабекошту паслуг насельніцтву, незаконнага атрымання субсідый, утойвання прыбытку ад падаткаабкладання, неэфектыўнага выкарыстання грашовых сродкаў.

Такую ацэнку калегія Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці дала па выніках аналізу абгрунтаванасці і правільнасці прымянення арганізацыямі ЖКГ тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі. Вось толькі некаторыя факты.

Паслуга тая ж, аплата розная

Праверка паказала, што ў сістэме ЖКГ адсутнічаў адзіны парадак фарміравання кошту санітарнага ўтрымання дапаможных памяшканняў. У выніку памер платы для насельніцтва за гэтую паслугу адрозніваўся ў разы і даходзіў да 150 тысяч рублёў з кватэры, нават у межах аднаго населенага пункта. І калі зрабілі пераразлік платы за прыборку гэтых памяшканняў па фактычных затратах згодна з нормамі прэзідэнцкіх указаў № 535 і № 107, то аказалася, што залішне налічаная і прад'яўленая людзям да аплаты сума склала... 2,6 мільярда рублёў.

Акрамя таго, своечасова не перагледзелі тарыф за тэхнічнае абслугоўванне жылых дамоў, які не павінен быў перавышаць планава-разліковую цану на 2016 год. Кошт гэтай паслугі ў дачыненні да плошчы жылых памяшканняў, якая перавышае норму, і пустуючых кватэр разлічылі па тарыфе 3200 рублёў за 1 м² — у 2,7 раза больш за гранічную планава-разліковую цану на гэты год.

Увогуле сёлета толькі за студзень па неабгрунтавана прымененым тарыфе прадпрыемствы ЖКГ залішне налічылі 1,9 мільярда рублёў — і 1,8 млрд руб. з гэтай сумы было аплачана насельніцтвам.

Даходзіла да абсурду. У Гродне выяўлены факты налічэння платы за «тэхнічнае абслугоўванне ліфта» і электраэнергію на яго работу ў трох жылых дамах (на агульную суму 2,9 мільёна рублёў), якія ўвогуле... не абсталяваны ліфтамі.

Больш — не значыць лепш

КУП «Слонімскае жыллёвае рамонтна-эксплуатацыйнае аб'яднанне» за 2013-2014 гады завысіла сабекошт паслуг па тэхнічным абслугоўванні жыллёвага фонду на 2,9 мільярда рублёў — за кошт неабгрунтаванага ўключэння ў разлік затрат на ўтрыманне швейцараў інтэрнатаў, фактычна нявыкананых работ па абрэзцы дрэў, затрат па абучэнні кадраў, амартызацыі тэхнікі, якая не выкарыстоўвалася. Усё гэта незаконна кампенсавалі субсідыямі з бюджэту.

На прадпрыемстве стварылі грувасткую структуру з 9 падраздзяленняў, кожнае з якіх мае кіраўніка, а функцыянальныя абавязкі асобных работнікаў дублююцца. Хоць, як вядома, колькасць кадраў зусім не гарантуе лепшую работу. Асабліва калі практыкуюць прызначэнне на пасады сваякоў кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый горада, у тым ліку з няпрофільнай адукацыяй. Па прадстаўленні Камітэта дзяржкантролю вобласці кіраўнік прадпрыемства вызвалены ад пасады.

Дарэчы, факты пакрыцця бюджэтнымі сродкамі завышэння сабекошту паслуг выяўляліся ўжо неаднойчы. Напрыклад, на прадпрыемстве «Ваўкавыская камунальная гаспадарка» ў 2014-2015 гадах неабгрунтавана ўключылі ў сабекошт паслуг па цеплазабеспячэнні затраты па мадэрнізацыі цеплавых сетак і кошт звышнарматыўных страт цеплавой энергіі ў сетках — увогуле на 2 мільярды рублёў.

Пры гэтым за два апошнія гады арганізацыі ЖКГ вобласці пры аказанні ўсіх відаў паслуг звышнарматыўна расходавалі і страцілі паліўна-энергетычных рэсурсаў на агульную суму больш за 20 мільярдаў рублёў.

Хто ў адказе?

«Галаўны боль» многіх прадпрыемстваў ЖКГ Гродзеншчыны — так званыя няпрофільныя актывы (маёмасць ваенных гарадкоў, аб'екты грамадзянскай абароны і г.д.). Увогуле на іх балансе 620 такіх аб'ектаў, не звязаных з аказаннем жыллёва-камунальных паслуг, з якіх 394 не выкарыстоўваюцца. Затраты на іх утрыманне за мінулы год склалі 8,6 мільярда рублёў, аднак пытанне аб заключэнні дагавораў паміж райвыканкамамі і прадпрыемствамі ЖКГ на абслугоўванне няпрофільных аб'ектаў з выдзяленнем сродкаў на іх утрыманне па сёння не вырашана.

Адным з негатыўных фактараў, што ўплываюць на фінансавае становішча арганізацый ЖКГ, з'яўляецца і выкананне работ без забеспячэння гаррайвыканкамамі крыніц іх аплаты.

Разам з тым не ўсюды задзейнічаюць рэзервы папаўнення абаротных сродкаў. Напрыклад, некаторыя прадпрыемствы ЖКГ не маюць атэстатаў адпаведнасці на выкананне будаўніча-мантажных работ. А значыць, самі не выконваюць работ на аб'ектах капітальнага рамонту свайго жыллёвага фонду за кошт бюджэтных сродкаў і адлічэнняў грамадзян і вымушаны плаціць інжынерным арганізацыям за паслугі па тэхнічным наглядзе.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
prakopchik@zviazda.by

ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ

ВЯСКОЎЦЫ ПЕРАЖЫВАЛІ ЗА КРАМУ...

У рэдакцыю газеты прыйшоў ліст, які падпісалі дзясяткі жыхароў Мёрскага раёна. Людзей непакоіць магчымая сумная перспектыва закрыцця крамы ў вёсцы Басянкі-3.

У звароце адзначалася, што ў краму прыходзяць па пакупкі і жыхары дзвюх суседніх вёсак (Немірава і Балаі). І ва ўсіх трох жывуць 140 чалавек. А суседняя крама знаходзіцца ў аграгарадку Язна ў 9 кіламетрах ад вёскі Басянкі-3...

«Па інфармацыі старшыні райпа, наша крама не з'яўляецца стратнай. Аднак пытанне аб яе далейшай працы не было вырашана станоўча. Мы разумеем, што ў апошні час у Мёрскім райпа ёсць цяжкасці. Але мы жывём далёка ад райцэнтра (у 68 кіламетрах. — **Аўт.**). І гэта крама нам вельмі неабходна... Нават той асартымент, які быў там, нас задавальняў».

Дарэчы, жыхары глыбінкі папрасілі рэдакцыю таксама паспрыяць райпа: «У забеспячэнні таварнай масай для рэнтабельнай працы гандлёвага прадпрыемства».

Сітуацыю карэспандэнту пракаментавалі ў Мёрскім райвыканкаме.

Аказалася, што крама аднавіла працу — пасля закрыцця на час водпуску прадаўца. Па ўзгодненні з Язненскім сельвыканкамам яна працуе ў аўторак, чацвер і суботу (з 10.00 да 18.00 з перапынкам з 13.00 да 14.00).

— Акрамя гэтага, дадатковае гандлёвае абслугоўванне жыхароў вёскі Басянкі-3 ажыццяўляецца аўтакрамай №59 Мёрскага райпа па панядзелках і чацвяргах... На сёння ў краму завезена тавараў на суму каля 50 мільёнаў рублёў. Кантроль за працай крамы, своечасовым завозам тавараў ускладзены на тавараведа Мёрскага райпа. Прадаўцу даручана сачыць за наяўнасцю тавару, захаваннем асартыментнага пераліку. Яна абавязана своечасова падаваць заяўкі на групы тавараў, якія адсутнічаюць, — адзначыў **намеснік старшыні Мёрскага райвыканкама Аляксандр БАДАНІН.**

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*

НАШ ДВОР

ДЗЕ ПАЗНАЕЦЦА СВЕТ?

Некалькі слоў пра асаблівую актуальнасць дзіцячых пляцовак

Летам запатрабаванасць дзіцячых пляцовак нашмат узрастае. Тыя, хто па розных прычынах не можа выехаць у вёску, на дачу альбо на працяглы адпачынак, дружна выходзяць у двары.

У дзесяць-адзінаццаць раніцы, як правіла, да пясочніц падцягваецца першая партыя маці з дзецьмі. У абед пляцоўкі пусцеюць, бо малыя адпачываюць, а пасля абеду тут асабліва многа наведвальнікаў. З дзецьмі гуляюць мамы, таты, дзядулі, бабулі. Вось як, напрыклад, на вуліцы Луцкай у Брэсце.

Луцкая і суседнія вуліцы ўяўляюць сабой раён тыповай забудовы канца 80-х — пачатку 90-х гадоў. Гэта самы, відаць, няўдалы перыяд у сэнсе праектавання жылля, калі для паркоўкі машын прастора фактычна не прадугледжвалася. Цяпер любы вольны лапік зямлі займаецца транспартам, які не толькі забірае месца ў патэнцыяльных пляцовак, але і «з'ядае» бардзюры, разбівае дарожнае пакрыццё вуліц. Некаторыя дамы на памянёнай вуліцы ўзведзены так, што праезная частка праходзіць у трох метрах ад пад'езда. А яшчэ асаблівасць названай вуліцы ў тым, што будынкі ў пачатку і ў канцы яе знаходзяцца па іншых вуліцах — Валгаградскай і 28 ліпеня.

Яшчэ адной характэрнай прыкметай вуліцы можна назваць вялікую колькасць дзяцей. На невялікай па працягласці тэрыторыі (адзін прыпынак гарадскога транспарту) размешчаны дзве школы, тры дзіцячыя садкі. У садок і школу зараз пайшлі ўнукі навасёлаў дамоў мікрараёна.

На пляцоўцы, якая размясцілася ў дварэ дамоў па вуліцы Валгаградскай, 28, 30 і Луцкай, 50, заўсёды шматлюдна. Маладыя бацькі Дар'я і Міхаіл Квяткоўскія прывялі на прагулку сына Даніка. Дар'я сказала, што яны жывуць у 50-м доме па Луцкай. Побач з ім пляцоўка зусім лядашчая, там для самых малых нават небяспечна гуляць, а тут — прастор, ніякіх машын побач. У пясочніцу завезены свежы пясок, ёсць горка, арэлі, а таксама турнікі, дзе могуць трэніравацца малодшыя школьнікі. Вось толькі грыбок, што засланяе ад сонца пясочніцу, хтосьці нядаўна прабіў у трох месцах.

Новая пляцоўка ад забудоўшчыка.

Беражлівага стаўлення да маёмасці дзіцячых пляцовак не хапае, — заўважае начальнік ЖЭСа № 11, чые рабочыя пляцоўку ўзводзілі, Аляксандр АЎДЗЯЙЧУК. — Там грыбок прабілі, у іншым месцы бардзюры пясочніцы папсавалі. Даводзіцца рамантаваць. Зараз на ЖЭС атрымалі ўсяго тры новыя грыбкі для замены, а ў нас іх 18.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

НАВЯДЗЕННЕ ПАРАДКУ

БУЛЬДОЗЕР ДЛЯ «ШЭРАЙ» НЕРУХОМАСЦІ

З самавольным будаўніцтвам у рэгіёнах пачнуць разбірацца чыноўнікі з міністэрскімі паўнамоцтвамі

Распараджэннем прэм'ер-міністра №267р у краіне створана рабочая група па пытаннях узмацнення адказнасці за самавольнае будаўніцтва.

Гэтая міжведамасная група ў хуткім часе пачне падрыхтоўку прапаноў аб узмацненні адказнасці за самавольнае будаўніцтва аб'ектаў і вызначэнні парадку дзеянняў у дачыненні да такіх аб'ектаў. Яе ўзначальвае міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль Чорны, яго намеснікам прызначаны намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Дзмітрый Семянкевіч. У склад рабочай групы ўваходзяць прадстаўнікі апарату Савета Міністраў, Генеральнай пракуратуры, Камітэта дзяржаўнага кантролю, Камітэта дзяржаўнай бяспекі, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Міністэрства юстыцыі, Дзяржаўнага камітэта па маёмасці, Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі і Мінгарвыканкама.

У дакуменце гаворыцца, што спецыялістам групы трэба будзе прыняць захады для правядзення рэвізіі аб'ектаў самавольнага будаўніцтва ў рэгіёнах. Акрамя таго, яны падрыхтуюць прапановы аб адзіным пераліку крытэрыяў, якія з'яўляюцца падставамі для аднясення нерухомасці да аб'ектаў самавольнага будаўніцтва ў сувязі з істотнымі парушэннямі горадабудаўнічых і будаўнічых нормаў і правілаў, а таксама для адмовы ў прыняцці рашэння аб працягу будаўніцтва або прыёме аб'екта самавольнага будаўніцтва ў эксплуатацыю і яго дзяржаўнай рэгістрацыі.

Даволі сур'ёзным пунктам прынятага распараджэння з'яўляецца наступны: **раней прынятыя рашэнні мясцовых улад па ўзаконьванні сумніўных аб'ектаў не лічацца цяпер для рэгіянальнага самабудавання канчатковай індульгенцыяй**. Група прапануе «парадак прызнання незаконнымі рашэнняў мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў пры выяўленні крытэрыяў, якія з'яўляюцца падставамі для аднясення пабудоў да аб'ектаў самавольнага будаўніцтва». Эксперты групы таксама забяспечаць распрацоўку праекта палажэння, якое рэгламентуе парадак дзеянняў у выпадку зносу аб'ектаў самавольнага будаўніцтва, канфіскацыі альбо прывядзенні такіх аб'ектаў у стан згодна з зацверджаным раней праектам.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

НА СВАІМ МЕСЦЫ

НАША ВЕРА

Старшыня сельскага Савета апраўдвае давер землякоў

Да аўтавакзала ў Мядзеле ліха падрульвае «Волга».
— Сядайце, калі ласка, — гучыць запрашэнне. — Я Вера Хацяновіч, старшыня Сваткаўскага сельскага Савета, вы ўчора мне тэлефанавалі... У салоне аўтамабіля яшчэ адна жанчына — Валянціна Анатолеўна Стрэж, галоўны спецыяліст раённага Савета дэпутатаў.

— Сваткаўскі — наш лепшы сельсавет. Нездарма Вера Уладзіміраўна ўзнагароджана Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Яе ўклад у развіццё мясцовага самакіравання сапраўды нельга пераацаніць. Яна ўжо 15 гадоў на сваёй пасадзе. Такія работнікі на вагу золата.

— Ой, не трэба мяне так хваліць, — усміхаецца Вера Уладзіміраўна. — Пагадзілася на гэтую пасаду часова. Думала папрацую крыху — ды сыду.

Але... адразу закруцілася на новай рабоце. Людзі, клопаты, праблемы... Канешне, цяжка было. Ды сумленне не дазволіла, так бы мовіць, дэзерціраваць.

— Здаецца, такіх добрых, сумленных, шчырых і працавітых людзей, як у нас, нідзе больш няма. Ёсць цэлыя дынастыі жывёлаводаў, трактарыстаў, хлебаробаў. Канешне ў адкрытым акцыянерным таварыстве «Сваткі» рады і прыезджым, але толькі тым, хто адказна ставіцца да работы, — расказвае Вера Уладзіміраўна.

Сваткаўскі сельсавет у параўнанні з іншымі невялікі: 26 населеных пунктаў, дзе жыве 1160 чалавек, налічваецца 540 двароў. Але пытанняў, з якімі звяртаюцца сяльчане, як і ўсюды, шмат. Бывае і так, што няма магчымасці вырашыць канкрэтную праблему. Калі яна не пад сілу, то старшыня так і кажа. Магчыма, камусьці гэта не падабаецца. Ды лепш праўда, чым пустыя абяцанкі. «Калі не стрымаеш слова, то людзі зусім па-іншаму будуць да цябе адносіцца», — упэўнена Вера Хацяновіч.

Дык яны смяюцца ў адказ: не вытрымаеш. Сапраўды, з іншага боку, як без зносін з людзьмі, я жыву іх праблемамі, зраслася з імі каранямі, — разважае Вера Хацяновіч. — Хоць без работы і дома не застанешся. На падворку куры, карова, бык. Летась хацелі збыць рагулю, але. Як жа ў вёсцы без каровы? Людзі скажуць: яна нас агітуе за падсобную гаспадарку, а сама пазбавілася ад карміліцы.

— Дарэчы, у нашым раёне з 9 старшынь сельскіх Саветаў толькі Вера Уладзіміраўна трымае вялікую гаспадарку, — удакладняе Валянціна Анатолеўна. — Яна наша, мясцовая, з дзяцінства да працы прывучаная. Яна тут усіх ведае, і яе ведаюць таксама.

У суседніх Альсевічах, дзе Вера нарадзілася, жыве яе старэнькая матуля, якую дачка забірае на зіму да сябе, а вясной адвозіць у родную хаціну. Добра, што ў жанчыны ёсць клапатлівая дачка, зяць, двое ўнукаў, якія падтрымліваюць, дапамагаюць. Не нарадуецца яна і праўнукам. Але ў вёсках сельсавета нямала адзінокіх, адзінока пражываючых пенсіянераў. Вера Уладзіміраўна часта іх наведвае, цікавіцца, якая дапамога ім патрэбна. Бывае, што чалавеку нічога не трэба. Галоўнае, каб яго выслухалі. Выгаварыцца — і лягчэй становіцца: адзінота — цяжкая ноша. У вёсцы Узла, напрыклад, працуе аддзяленне кругласутачнага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту і інвалідаў, якое прытуліла і некаторых сваткаўскіх жыхароў. Валянціна Уладзіміраўна пры нагодзе ніколі не абміне гэты дом, дзе загадчыцай дэпутат сельскага Савета Бернарда Макоска.

А наогул, працаваць заўсёды лягчэй, калі работнікі не дзеляць абавязкі на «свае» і «чужыя». Невялікі калектыў Сваткаўскага сельскага Савета — дружная каманда: кіраўнік спраў Наталля Калбун, бухгалтар Алена Раскова. Жанчыны падстрахоўваюць адна адну, замяняюць, разам працуюць на суботніках, дзяжураць падчас свят, могуць прыйсці на работу раней і затрымацца дапазна. Бадай, таму і няма скаргаў ад вяскоўцаў на арганізацыю гандлю, пошты, транспарту. На кантролі мясцовай улады — работа аўтакрамаў, стан дарог, якасць вулічнага асвятлення.

— Мне здаецца жыццё ў горадзе робіць чалавека больш жорсткім, нястрыманым. Усе спяшаюцца, бягуць, часта не саступаюць адно аднаму дарогу. Калі бываю ў сталіцы на курсах, семінарах, то ледзь вытрымліваю тыдзень, — кажа Вера Хацяновіч. — І сэрца баліць, і галава... А вернешся назад — зноў здаровы, адпачываеш душой сярод сваіх людзей.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

> Як жа ў вёсцы без каровы? Людзі скажуць: нас агітуе за падсобную гаспадарку, а сама?

Сёлета з раённага бюджэту выдзелілі 40 млн рублёў на добраўпарадкаванне. За гэтыя грошы і могілкі трэба прывесці ў парадак, і агароджы паставіць, і абкасіць, і нешта падрамантаваць. Вядома, на ўсё не хапае. Паблізу вялікіх гарадоў сельвыканкамы зарабляюць шляхам продажу зямельных участкаў, аб'ектаў нерухомасці. У Сватках, якія знаходзяцца далёка ад бойкіх шляхоў, такой магчымасці няма. Праўда, у 2013 годзе прадалі ўчастак у вёсцы Наўры за 17 млн рублёў. Сёлета 15 ліпеня запланавалі яшчэ адзін аўкцыён па продажы зямельнага надзела. У фінансавым аддзеле райвыканкама паабяцалі, што ўсе грошы пакінуць сельсавету на добраўпарадкаванне. «Думаю, ахвотныя на гэтую зямлю будуць», — спадзяецца мая суразмоўца.

— Работа сама знаходзіць Веру Уладзіміраўну, — жартуе Валянціна Стрэж. — Каза залезла ў агарод — бягуць скардзіцца ў сельвыканкам, святло прапала — таксама да яе. Па кожнай дробязі. Некага трэба памірыць з суседам, іншага проста суцешыць...

— Часам вельмі стамляюся. Думаю, дапрацую да канца гэтага склікання — і ўсё. Кажу сваім землякам: маўляў, пабуду год дома, а там знайду іншую работу.

ГАЛАСЫ ВЁСАК

ІНІЦЫЯТЫВЫ ЖЫВУЦЬ САМАСТОЙНА

Вялікая трохгадовая работа завершана: 40 ініцыятыў, увасобленых на Рагачоўшчыне, былі прадстаўлены на заключнай прэзентацыі, фінал якой прайшоў у вёсцы Курганне. Тут, на беразе ракі, сышліся ўсе актывісты праекта «Стварэнне эфектыўнай сістэмы культурных і інфармацыйных паслуг для сельскага насельніцтва «Свет інфармацыі, культуры і творчасці — для ўсіх». 250 000 еўра — грант Еўрапейскага саюза — быў патрачаны на тое, каб людзі, якія жывуць на поўначы Гомельшчыны, адчулі: у іх з'явіліся інструменты, дзякуючы якім яны могуць самі зарабляць грошы і быць цікавымі іншым.

Ірына Седлер, кіраўнік праекта, з захапленнем расказвае пра кожную з ініцыятыў:

— За гэты час мы падтрымалі больш за 20 фальклорных калектываў: з Лучына, Высокага, Стрэнек, Балотні, Ціхініч, Гадзілавіч. Ім былі зроблены народныя строі ў традыцыях менавіта нашага Рагачоўскага раёна. У Стрэньках ёсць аматарскі калектыў бытавога танца. На нашым свяце яны вучылі танцаваць дарослых і дзяцей кракавякі ды падэспані. У Курганні на свяце «Галасы вёсак» напрыканцы ўтварылі карагод, у якім кружыліся ўсе ўдзельнікі ў сваіх новых касцюмах.

Між тым на прэзентацыі за 5-7 хвілін кожная з груп, якая прадстаўляла ініцыятыву сваёй вёскі, прадставіла міні-праграму з абавязковым удзелам прысутных. Вёска Кісцяні, напрыклад, прадэманстравала, як у іх праходзіць абрад гукання вясны, а Гадзілавічы — свята Купалля. Дарэчы, людзі выступілі ініцыятарамі адраджэння менавіта тых традыцый, якія некалі існавалі ў населеных пунктах.

Іх на Рагачоўшчыне каля 200, але далёка не ва ўсіх ёсць установы культуры. Менавіта таму ў межах праекта былі набыты аўтобус і апаратура для перасоўнага клуба, які выязжае ў аддаленыя вёскі з канцэртамі. Так здарылася, што самая вялікая суполка актыўных жыхароў — у аграгарадку Лучын. Гэта менавіта яны ўвасобілі ў жыццё ініцыятыву пра аднаўленне колішняга свята «Грай, гармонік». І цяпер штогод з навакольля спяваць вясёлыя прыпеўкі пад гармонік з'язджаюцца ў Лучын самыя галасістыя хлопцы і дзяўчаты. Ёсць тут і дзіцячы клуб выхаднога дня «Нядзелька». Іх актыўнасці можна толькі пазайздросціць. Пад кіраўніцтвам дарослых дзеці розных узростаў выязджаюць на экскурсіі, праводзяць шмат спартыўных спаборніцтваў. Менавіта таму для ўсіх удзельнікаў дзякуючы гранту ЕС набыты спартыўны рыштунак і касцюмы для выступленняў.

> Магчыма, невялічкія музеі, створаныя ў маленькіх населеных пунктах, не дадуць ім загінуць.

Правядзенне фестывалю «Смак мёду» ў вёсцы Забалаць, на чыстай ад радыяцыі тэрыторыі — ініцыятыва мясцовых бортнікаў. У вёсцы Збароў на Рагачоўшчыне створаны экамузей зёлак. Раённы аддзел культуры прадаставіў памяшканне, а за кошт сродкаў праекта былі цалкам зроблены рамонт, афармленне, набыта абсталяванне і мэбля. Цяпер музей часта наведваюць шматлікія пацыенты санаторыя «Дняпроўскія сосны». Арганізатары ўстановы з інтарэсам і задавальненнем займаюцца вырошчваннем і збіраннем лекавых раслін. Яны ж дзеляцца з наведвальнікамі тэхналогіямі нарыхтоўкі, перапрацоўкі, захавання і выкарыстоўвання лекавай сыравіны. У межах праекта для іх была заказана спецыяльная сувенірная прадукцыя.

— Многім людзям цікава паглядзець, чым жыве беларуская глыбінка, — адзначае Ірына Седлер. — Пазнаёміцца з тымі старажытнымі абрадамі, якія захаваліся тут. Хочацца, каб пра нас ведала як мага больш людзей, каб да нас прыязджалі не толькі з санаторыя, але і з іншых краін. Мы іх зможам прыняць дастойна і расказаць пра свае адметнасці.

Усяго за кошт сродкаў праграмы Еўрасаюза для ўвасаблення ініцыятыў жыхароў Рагачоўшчыны былі набыты камплекты рознай апаратуры і тэхніка: камп'ютары, мультымедыйныя ўстаноўкі, газонакасілкі, іншае абсталяванне. Чатыры музеі з'явілася на Рагачоўшчыне ў межах праекта. У тым ліку экспазіцыю «Драўляныя карункі» прадставілі рэзчыкі па дрэве з пасёлка Ільіч. Яна прысвечана драўлянаму дойлідству, традыцыі ўпрыгожвання хат ліштвой, аканіцамі. Музей шапак быў створаны ў вёсцы з красамоўнай назвай Шапчыцы...

Магчыма, невялічкія музеі, створаныя ў маленькіх населеных пунктах, не дадуць ім загінуць. Гэта ж тычыцца і музея, адкрытага ў Курганні падчас свята «Галасы вёсак». Размова пра экспазіцыю, прысвечаную Уладзіміру Людвігавічу Кігн-Дзедлаву. Імя гэтага таленавітага пісьменніка, паплечніка Антона Чэхава, вядома не вельмі шырока. Але на Рагачоўшчыне лічаць, што яго творчая літаратурная спадчына вартая вывучэння. Сёлета споўнілася 160 гадоў з дня нараджэння пісьменніка, і гэта стала падставай для адкрыцця музея на яго радзіме.

Фрагмент троіцкага абраду прадстаўляе Лучынскі дом культуры.

Разам з кіраўніцтвам Рагачоўскага райвыканкама і райсавета каардынатар праектаў прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі Таццяна Пранько ўручыла памятныя сертыфікаты прадстаўнікам усіх 40 ініцыятыў.

Безумоўна, за кожнай увасобленай ініцыятывай стаяць людзі, пра кожнага з якіх можна расказваць асобна. Але ж усе яны разам атрымалі тыя магчымасці, якія дазволяць ім развіваць прыродныя здольнасці. Кожнаму — у сваім напрамку. Многія з іх, верагодна, яшчэ прадставяць сваю творчасць на Дні пісьменства, які сёлета адбудзецца ў Рагачове.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

НА КАНТРОЛІ

РЭВІЗОРЫ, АХАЛАДЗІЦЕ ПЫЛ!

Падчас Усебеларускага сходу яшчэ раз прагучала думка пра тое, што вытворцам і прадпрымальнікам не трэба перашкаджаць у іх дзейнасці.

Залішнія праверкі розных наглядных і іншых органаў не дапамагаюць працаваць. Таму дзейнасць тых, хто правярае, таксама правяраюць.

Сітуацыя з праверкамі абмяркоўвалася на сумесным пасяджэнні калегій Камітэта дзяржкантролю і пракуратуры вобласці.

Дарэчы, яшчэ ў 2009 годзе выйшаў Указ Прэзідэнта №510 «Аб удасканаленні кантрольнай (наглядной) дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь».

— Больш за 6 гадоў дзейнічае ўказ, які быў прыняты для кардынальнага скарачэння колькасці праверак. Паралельна ён павінен спрыяць стварэнню сістэмы папераджальнага кантролю, якая не перашкаджала б рэалізацыі дзелавой ініцыятывы. Але па-ранейшаму дапускаюцца парушэнні і хібы, — сказаў **Вадзім ЗАРАНКІН, старшыня Камітэта дзяржкантролю Віцебскай вобласці.**

За апошнія тры гады колькасць усіх праверак на Віцебшчыне не перавысіла 16,7 тысячы. Найбольш актыўныя — інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах (каля 2,9 тысячы праверак). А сярод наглядных органаў — падраздзяленні Міністэрства аховы здароўя, МНС, інспекцыя Дзяржбуднагляду. Для параўнання, летась Камітэтам дзяржкантролю вобласці зроблена толькі 101 праверка.

Як адзначылі ў камітэце, па-ранейшаму вялікая частка праверак — пазапланавыя. Пры гэтым іх колькасць узрасла летась на 7,2%. Значная праверачная нагрузка прыпадае на некаторыя арганізацыі. Даходзіла да 40 і больш праверак у год — і гэта на адно прадпрыемства! Некаторыя праверкі, якія праводзіліся па даручэнні праваахоўных органаў, цягнуліся да 140 дзён!

«Рэвізорам» нагадалі, што не патрэбны праверкі дзеля саміх праверак. Калі ўжо збіраецеся, напрыклад, на мясакамбінат, дык прыходзьце, калі ёсць дакладная інфармацыя аб парушэнні, якое ўчыняецца. Або, калі, скажам, цікавіць будаўнікі, дык даследуйце адразу некалькі аб'ектаў замест аднаго.

На калегіі дадзены канкрэтныя даручэнні ўпаўнаважаным органам вобласці па ўпарадкаванні кантрольнай і наглядной дзейнасці і скарачэнні праверак.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

БУСЕЛ ЗАТРЫМАЎСЯ Ў ДРЫБІНЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Спачатку яна зусім не ішла на кантакт, — кажа Ларыса Арцёменка. — Спрабавалі дастукацца да яе праз маці, праз суседзяў — безвынікова. Маладая дзяўчына не спяшалася выпраўляцца, ісці працаваць. Пасля чарговага запою, які зацягнуўся, пачалі збіраць дакументы, каб перадаць дзіця пад апеку дзяржавы. У выніку дзяўчынку змясцілі ў прытулак. Жанчына зразумела, што ўсё сур'ёзна, закадзіравалася, пайшла працаваць. Праз 4 месяцы ёй вярнулі дачку. Вось ужо два гады, як Наталлю ніхто з бутэлькай не бачыў.

Знайшла ў сабе сілы пачаць новае жыццё і шматдзетная маці з Трылесіна. Праз сваю цягу да спіртнога яна перыядычна трапляла ў групу сацыяльна небяспечных. Скончылася тым, што пазбавілася правоў на чацвёра сваіх дзяцей. Але хапіла сіл узяцца за розум. Летась дзеці вярнуліся да маці. Цяпер сям'і аказваецца ўсялякая дапамога, у тым ліку адрасная. У раёне наладжаны сувязі з дабрачынным італьянскім фондам і падлеткі маюць магчымасць адпачываць за мяжой. Італьянцы нават дапамаглі аднаму з дзяцей зрабіць аперацыю.

Без дыму і агню

Для **Уладзіміра АТРАХІМЁНКІ, які працуе інспектарам групы прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Дрыбінскага аддзела па надзвычайных сітуацыях,** праца і ахова інтарэсаў сям'і ўжо даўно сталі словамі-сінонімамі. Некалькі гадоў таму ў якасці дэпутата райсавета ён дапамагаў вырашаць землякам сацыяльныя праблемы. Ды і сёння пры наведванні канкрэтнай сям'і не абмяжоўваецца прафілактыкай работы пячнога ці электрычнага абсталявання — звяртае ўвагу і на тое, чым людзі «дыхаюць».

Галаўны боль для ратаўнікоў — дзеці без нагляду. Уладзімір памятае, як 4 гады таму да бабулі ў вёску прыехалі ўнукі з Магілёва, знайшлі стары матрац і падпалілі яго. Добра яшчэ, што гэта адбылося на вуліцы, а не ў доме... Нагул, за апошнія два гады пажараў з прычыны дзіцячага свавольства ў раёне не было.

З 2005 года Уладзімір Атрахімёнак выкладае дзецям асновы бяспекі жыццядзейнасці. Раней гэта быў абавязковы прадмет у школах, цяпер, на жаль, факультатыўны. Карысць жа ад яго нельга перабольшыць. Не ўсе дарослыя ведаюць, як паводзіць сябе ў экстрэмальных сітуацыях. Што казаць пра дзяцей? Раз на тыдзень ратаўнік праводзіць двухгадзінныя заняткі ў Дрыбінскай сярэдняй школе і Цэнтры пазакласнай дзейнасці. І вельмі ганарыцца, што ўжо трое яго выпускнікоў працуюць у аддзелах па НС у Дрыбіне і Горках.

Зараз канікулы, і ратавальнікі кантралююць яшчэ і лагеры пры школах. Трэба глядзець, каб адпачынак дзяцей праходзіў «без дыму і агню». Менавіта так называецца прымеркаваная да школьных канікул рэспубліканская акцыя.

— Аднымі забаронамі справу не вырашыш, трэба чымсьці зацікавіць падлеткаў, — з веданнем справы кажа суразмоўца. — Прафілактычныя мерапрыемствы праводзім у выглядзе гульні. Дзесьці відэаролік разам паглядзім, дзесьці сродкі пажаратушэння пакажам або прыклад да месца прывядзём. Зараз лета, і трэба нагадваць, як паводзіць сябе пры навальніцы, як на вадаёмах, чым пагражае выпальванне сухой расліннасці.

Кірыл стаў сімвалам аднаўлення сям'і (з мамай Святланай).

Дзеля дзіцяці

Цяжэй уздзейнічаць на дарослых, асабліва адзінокіх. У сельсаветах усе «асацыялы» на ўліку. Перыядычна з імі працуюць падчас пасяджэння савета грамадскіх пунктаў аховы правапарадку. Пры кожным сельсавеце існуюць наглядальныя камісіі.

За Уладзімірам Атрахімёнкам у раёне замацавана 12 вёсак, ён там адказны за супрацьпажарную прапаганду. Асабіста наведвае сем'і — як па службовых абавязках, так і разам з камісіямі, прымае ўдзел у пасяджэннях грамадскіх пунктаў.

— Але, калі чалавек сам не пажадае выпраўляцца, намаганні амаль роўныя нулю, — кажа ён. — Неяк наведалі мужчыну, нагадалі, што небяспечна курыць у ложку, злоўжываць спіртным, а ноччу паступіў сігнал, што яго дом гарыць.

Святлана КІРЫЛАВА, намеснік старшыні раённай камісіі па справах непаўналетніх, выратавала не адну сям'ю. Для іх яна і дарадчыца, і псіхолаг, і самы блізкі чалавек.

— Ёсць у нас жанчына вельмі праблемная, — расказвае яна. — У яе было дзіця ад першага шлюбу, сужыцель свайго прывёў, ды яшчэ агульнае нарадзілася. Але жыць у згодзе не атрымліваецца. Гаспадыня яна выключная, але калі пачынае піць, усё ідзе бязладна. Што толькі ні рабілі — і дзяцей забіралі, і правоў пазбаўлялі, а яна не выпраўляецца. Некаторы час трымаецца, але як толькі ёй дзяцей вернуць, пускаецца ва ўсе цяжкія. Зараз зноў ездзіць па прыёмных сем'ях, дзяцей наведвае, просіць, каб вярнулі...

На думку Святланы Кірылавай, праект «Сям'я — для дзяцей» даказаў, што можна працаваць з праблемнымі сем'ямі без пазбаўлення іх бацькоўскіх правоў. Але гэта патрабуе вялікіх псіхалагічных выдаткаў. Прыходзіцца ўвесь час жыць чужымі праблемамі. Аднойчы да яе прыйшла раз'юшаная жанчына, пагражала, што будзе скардзіцца ў розныя інстанцыі. А потым, калі выказалася, падзякавала за ўвагу і пайшла. «Я пры гэтым амаль нічога не сказала, — смяецца Святлана Уладзіміраўна. — Чым не прыклад, што людзям не хапае элементарнай увагі».

Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота аўтара.

ДЗЕ ПАЗНАЕЦЦА СВЕТ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

У начальніка ЖЭСа карэспандэнт «МС» пацікавілася, што за канструкцыі стаяць ля некаторых дамоў. Бетонныя аркі дзе-нідзе з такімі ж бетоннымі дарожкамі займаюць многа месца, яны пазарасталі травой, ніяк не выкарыстоўваюцца. Аказалася, гэтыя грувасткія пабудовы ўзводзілі падчас будаўніцтва жылля як дзіцячыя гарадкі-пляцоўкі пры кааператыўных дамах. А вось замацаваць іх за кім-небудзь забыліся, як бывала на пачатку 90-х. За два дзясяткі гадоў, пакуль іх ніхто не даглядаў, яны часткова паразбураліся, зрабіліся непрыдатнымі і нават сталі небяспечнымі. Іх, на добры толк, цяпер неабходна зносіць. Але ж на гэта патрэбны немалыя сродкі. Лішніх грошай ніхто не мае. Так і стаяць гэтыя «катакомбы», а на іх месцы маглі б быць сапраўдныя пляцоўкі для дзяцей.

Праўда, яны і ёсць па ўсёй вуліцы. Хоць невялікія, з мінімальным наборам дзіцячых атракцыёнаў. Як, напрыклад, каля кааператыўнага дома №36 па Луцкай. Мама двух сыноў Вольга Васілюк гуляе з імі тут кожны дзень. Малодшы Паша любіць катацца з горкі альбо на арэлях. І ўсе малыя насельнікі двара выходзяць з дому з поўным наборам цацак, каб будаваць мудрагелістыя пясочныя палацы.

— Усім нам, мамам, хацелася б, каб у нас была такая пляцоўка, як побач з новымі дамамі 33А і 33Б па вуліцы 28 Ліпеня, куды і мы часам наведваемся, — гаворыць Вольга. — Тыя пляцоўкі летась здаваліся забудоўшчыкам разам з дамамі. Але добра, што ў нашым двары ёсць хоць невялікая свая. Гэта месца, дзе нашы дзеці вучацца пазнаваць свет, упершыню сутыкаюцца з жывой прыродай. Дрэнна толькі, што асобныя жыльцы без павагі ставяцца да дзіцячага насельніцтва. Кажу найперш пра гаспадароў сабак, якія не прыбіраюць за сваімі гадаванцамі. Іншым разам баішся дзіця выпусціць на зямлю, бо яно можа ўлезці ў прадукт сабачай жыццядзейнасці. А дзіцячыя пляцоўкі і тэрыторыя вакол іх павінны быць забароненай зонай для сабачнікаў. І гэта залежыць толькі ад іх сумлення, — заўважае маладая маці.

У кожнай паўакружнасці дамоў, якія і складаюць дваровыя тэрыторыі па ўказанай вуліцы, ёсць дзіцячыя пляцоўкі. Хоць невялікія, не багата аснашчаныя, але ёсць. Прыкладна палавіна іх належыць ЖЭСу, астатнія ўзведзены за кошт сродкаў кааператываў. Начальнік ЖЭСа №11 Аляксандр Аўдзяйчук сказаў, што грошы для паляпшэння названых аб'ектаў выдзеленыя, і некаторыя з іх будуць адрамантаваны і добраўпарадкаваны яшчэ ў гэтым годзе. Кааператывы вырашаюць гэта пытанне самастойна. Як адзначыў **старшыня Брэсцкага гарадскога Савета дэпутатаў Мікалай КРАСОЎСКІ**, прэзідыум гарсавета даручыў дэпутатам каардынаваць работу грамадскіх ініцыятыў у гэтым кірунку. Цяпер пляцоўкі ўзводзяцца найбольш за сродкі грамадзян. Але да такіх аб'ектаў ёсць асаблівыя патрабаванні, прадыктаваныя правіламі бяспекі. Таму пры правядзенні работ павінны быць прыцягнутыя адпаведныя спецыялісты і арганізацыі. Вось гэта і ёсць клопат дэпутата.

...Да 1000-годдзя заснавання Брэста застаецца тры гады. Пачынаецца многа праектаў па ўдасканаленні гарадской інфраструктуры, іншымі словамі, разгортваецца вялікая будоўля, асабліва ў цэнтральнай частцы горада. У сувязі з гэтым **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК** падрыхтаваў спецыяльны зварот да гараджан. Мэр просіць праявіць падтрымку і разуменне ў перыяд, калі давядзецца цярпець транспартныя і іншыя абмежаванні. І гэта зразумела. Часовыя нязручнасці акупяцца потым прыгожымі і дагледжанымі вуліцамі, адноўленымі старымі будынкамі і кварталамі. Але пры гэтым вельмі важна не забывацца пра двары, дзе людзі бавяць час кожны дзень і дзе малыя пазнаюць свет, вучацца ўспрымаць навакольнае асяроддзе і ўсведамляць сябе як частку родных мясцін.

Вольга Васілюк з сынам Паўлам.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 12 ліпеня 2016 года.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

Организатор аукциона –

НАРОВЛЯНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

Предмет аукциона – право заключения договора аренды на земельный участок, площадью 0,0406 га с кадастровым номером 323850100002001031, расположенный по адресу: Гомельская область, г. Наровля, ул. Коммунистическая, 29.

Имеются ограничения в использовании земельного участка на площади 0,0406 га в связи с его расположением на природной территории, подлежащей специальной охране (водоохранная зона реки Припять), и на территории, подвергшейся радиоактивному загрязнению

Целевое назначение использования земельного участка – для строительства и обслуживания магазина (земельный участок для размещения объектов розничной торговли). Срок аренды земельного участка – 30 (тридцать) лет.

Обеспечение объекта сетями электроснабжения, водоснабжения и газоснабжения осуществляется от существующих сетей.

Начальная цена продажи – 2000,31 (две тысячи рублей тридцать одна копейка).

Сумма задатка – 200,03 (двести рублей три копейки).

Размер шага аукциона составляет 10% от предыдущей цены, названной аукционистом.

Условия продажи:

- внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка;
- возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка;
- заключение победителем аукциона с Наровлянским районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществления в установленном порядке государственной регистрации прав на земельный участок;
- разработка и утверждение в установленном порядке проектно-сметной документации на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;
- снятие, сохранение и использование плодородного слоя почвы согласно строительному проекту;
- освоение земельного участка в срок до шести месяцев после разработки и утверждения проектно-сметной документации;
- осуществление строительства на условиях и в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

1. **Аукцион состоится 17 августа 2016 г. в 10.00 в здании Наровлянского районного исполнительного комитета (каб. 12), по адресу: г. Наровля, ул. Коммунистическая, 3.**

2. Для участия в аукционе приглашаются индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, подписавшие соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона на право заключения договора аренды земельного участка.

Для участия в аукционе необходимо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) подать в землеустроительную службу райисполкома в установленный в настоящем извещении срок заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который предполагается получить в аренду по результатам аукциона, к которому прилагаются следующие документы: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом Республики Беларусь либо индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица Республики Беларусь либо индивидуального предпринимателя; гражданином Республики Беларусь – копию документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования.

3. **Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30, последний день приема документов – до 17.30 12 августа 2016 года по адресу: г. Наровля, ул. Коммунистическая, 3. Заключительная регистрация участников 17 августа 2016 г. с 9.00 до 9.45.**

4. Сумма задатка перечисляется на счет № 3604407680324 в ЦБУ № 318 г. Наровля «АСБ Беларусбанк» г. Мозырь, УНН 400056085, получатель – Наровлянский районный исполнительный комитет.

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

6. Организатор открытого аукциона вправе отказаться от аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до проведения аукциона.

За дополнительной информацией обращаться в Наровлянский районный исполнительный комитет (землеустроительная служба), контактный телефон в г. Наровля 8 (02355) 2-18-67.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БПХО»

№ п/п	Наименование лота	Местонахождение	Начальная цена продажи, с учетом НДС, руб. коп.	Задаток 20 %, руб. коп.
1.	**Лот № 17** – капитальные строения и прочее имущество:			
1.1	Здание столовой-заготовочной с инвентарным номером 110/С-93065, площадью 1959,6 кв.м	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га	**860 868,60**	**172 173,72**
1.2	Хозяйственный сарай №1 с инвентарным номером 110/С-102285, площадью 16,8 кв.м	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3/3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га	**5 756,04**	**1 151,21**
1.3	Хозяйственный сарай №2 с инвентарным номером 110/С-102300, площадью 80,2 кв.м	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3/4, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га	**17 439,24**	**3 487,85**
1.4	Благоустройство с инвентарным номером 110/С-102283, площадью 4692,0 кв.м	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га	**146 364,72**	**29 272,94**
1.5	Благоустройство (деревья) с инвентарным номером 110/С-102283	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га	**4 992,48**	**998,50**
1.6	Водопроводная сеть с инвентарным номером 110/С-102288, протяженностью 23,3 м	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га	**425,04**	**85,01**
1.7	Канализационная сеть с инвентарным номером 110/С-102287, протяженностью 221,2 м	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3, на земельном участке с кадастровым номером 141000000006000795, площадью 0,4189 га	**1 502,64**	**300,53**
1.8	Передаточное устройство: Низковольтная кабельная линия, инвентарный номер 050012 по бухгалтерскому учету ОАО «БПХО»	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3	**277,80**	**55,56**
1.9	Противопожарная сигнализация А16-512 № 29/07 АПС, инвентарный номер 100217 по бухгалтерскому учету ОАО «БПХО»	Брестская область, г. Барановичи, ул. Фабричная, 3	**2 147,28**	**429,46**
	ИТОГО:		**1 039 773,84**	**207 954,77**

Аукцион состоится 15 августа 2016 в 14.00 по адресу: 225410, г. Барановичи, ул. Фабричная, 7, каб. 503, 5-й этаж.

Организатор аукциона: открытое акционерное общество «Барановичское производственное хлопчатобумажное объединение» (ОАО «БПХО»), г. Барановичи, ул. Фабричная, 7.

Прием заявлений и документов на участие в аукционе осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Фабричная, 7 каб. 602. Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **12.08.2016**.

Задаток вносится до подачи заявления на участие в аукционе на р/с 3012605450052 в отделении ОАО «АСБ Беларусбанк», код 150501245, получатель платежа – ОАО «БПХО», УНП 200166488.

Шаг торгов – 5 процентов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 10 рабочих дней со дня подписания (утверждения) протокола о проведении аукциона. Сроки оплаты за предмет аукциона устанавливаются при заключении договора купли-продажи с продавцом.

Победитель (единственный участник) аукциона в течение 3 рабочих дней после дня проведения аукциона (утверждения протокола) возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии с Соглашением.

Дополнительную информацию можно получить у организатора аукциона: (80163): 47-63-80 – главный инженер Сергеева Леся Ивановна, 47-63-50, 47-65-17 – начальник ОКС Шамкуть Нина Михайловна.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2016 г.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2016 год	2015 год
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		1 156 564	1 203 697
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		2 575	4 759
4	Средства в Национальном банке	1103		2 534 482	6 043 824
5	Средства в банках	1104		3 770 692	694 985
6	Ценные бумаги	1105		21 977 763	12 733 606
7	Кредиты клиентам	1106		63 960 499	61 039 715
8	Производные финансовые активы	1107		243	6 462
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108		974 112	929 082
10	Основные средства и нематериальные активы	1109		2 640 367	2 422 781
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110		144 758	646
12	Отложенные налоговые активы	1111		-	-
13	Прочие активы	1112		1 627 502	1 098 082
14	ИТОГО активы	11		98 789 557	86 177 639
15	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
16	Средства Национального банка	1201		3 307 914	4 038 900
17	Средства банков	1202		17 554 589	10 453 865
18	Средства клиентов	1203		57 476 406	53 236 095
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204		7 009 828	6 581 283
20	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
21	Отложенные налоговые обязательства	1206		42 640	11
22	Прочие обязательства	1207		238 807	315 538
23	ВСЕГО обязательства	120		85 630 184	74 625 692
24	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
25	Уставный фонд	1211		8 103 635	6 803 635
26	Эмиссионный доход	1212		-	-
27	Резервный фонд	1213		1 001 105	980 000
28	Фонды переоценки статей баланса	1214		1 418 406	1 205 319
29	Накопленная прибыль	1215		2 636 227	2 562 993
30	ВСЕГО собственный капитал	121		13 159 373	11 551 947
31	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12		98 789 557	86 177 639

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – июнь 2016 года

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«Белагропромбанк»

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2016 год	2015 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		5 441 787	5 595 737
2	Процентные расходы	2012		4 403 347	4 876 464
3	Чистые процентные доходы	201		1 038 440	719 273
4	Комиссионные доходы	2021		729 254	562 424
5	Комиссионные расходы	2022		297 582	118 437
6	Чистые комиссионные доходы	202		431 672	443 987
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		472	854
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		31 133	(21 228)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		81 378	235 328
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		(33 744)	78 180
11	Чистые отчисления в резервы	207		418 699	349 903
12	Прочие доходы	208		147 344	451 735
13	Операционные расходы	209		1 031 596	1 011 576
14	Прочие расходы	210		111 469	134 395
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		134 931	412 255
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		57 087	104 773
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		77 844	307 482
18	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях				
19	Базовая прибыль на простую акцию	22		-	-
20	Разводненная прибыль на простую акцию	23		-	-

Председатель Правления А.А.Лысюк

Главный бухгалтер М.А.Шаповалова

Дата подписания «6» июля 2016 г.

www.belapb.by
ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136

http://www.belapb.by/rus/about/bank-activity/indexes/individualnaya-otchetnost-po-nacionalnym-standartam/quarterly-reporting/?fp=date_july

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
	ЛОТ 1
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 401/С-29268 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание складского помещения), площадью 267,0 кв.м м п., расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Ленина, 41А
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 422050400002002593, (назначение – для обслуживания здания складского помещения), площадью 0,0647, расположенный по адресу: г. Скидель, ул. Ленина, 41А
Начальная цена продажи	55 500 р. (пятьдесят пять тысяч пятьсот рублей) с учетом НДС
Сумма задатка	5 550 р. (пять тысяч пятьсот пятьдесят рублей)
Условия аукциона	Без условий
Продавец	Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб.209, тел.: 41-98-32, 45-05-38
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225
Аукцион состоится 15 августа 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209	

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница).

Последний день приема заявлений – 09 августа 2016 г. до 15.00.

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/

УЗДЕНСКИЙ РАЙИСПОЛКОМ

12 августа 2016 г. в 10.00 по адресу: Минская область, г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 418 (4-й этаж)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРЕДОСТАВЛЕНИЮ ПОВЕРХНОСТНОГО ВОДНОГО ОБЪЕКТА – ОБВОДНЕННОГО КАРЬЕРА

общей площадью 2,3 га, расположенного на территории Узденского района Минской области между 51 и 52 км автодороги Р-23 Минск–Микашевичи, в аренду для рыбоводства с заключением по результатам аукциона договора аренды сроком на 10 лет.

Начальная цена объекта аукциона – 14 белорусских рублей 49 копеек.

Аукцион будет проводиться в порядке, определенном пунктом 17 Положения о порядке проведения торгов по предоставлению поверхностных водных объектов в аренду для рыбоводства, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 15 октября 2015 г. № 861.

Задаток в размере 20% от начальной цены объекта аукциона составляет 2 белорусских рубля 90 копеек, вносится в срок не позднее 8 августа 2016 г. путем безналичного расчета платежным поручением на расчетный счет Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области № 3600631002518 в ЦБУ № 625 филиала №500 – Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 600537220, код платежа 04004.

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/

ИЗМЕНЕНИЯ К ПРОЕКТНЫМ ДЕКЛАРАЦИЯМ Государственного предприятия «УКС Фрунзенского района г. Минска»,

опубликованным в газете «Звязда» от 11.06.2016 № 110 (28220), от 23.06.2016 № 118 (28228).

В связи с передачей квартир, подлежащих безвозмездной передаче в собственность г. Минска в счет усредненного показателя с общей площади жилых помещений объекта «Разработка комплексного архитектурного проекта жилой застройки с объектами инженерной инфраструктуры и улично-дорожной сети в границах улиц Шаранговича, Горецкого, Рафиева. Микрорайон № 4». (1-я очередь строительства.) Многоквартирный жилой дом № 1 по генплану, исключить квартиры № 6, 7, 96 из декларации от 11.06.2016 № 110 (28220); квартиру № 102 из декларации от 23.06.2016 № 118 (28228). УНП 190580553

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	- Капитальное строение, инв. № 420/С-26297 (назначение – здание механического цеха), общей площадью 1895,2 кв.м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. 8 Марта, 28Б. Составные части и принадлежности: - благоустройство – пешеходная часть, площадью 587,7 кв.м; - линия электропередач (напряжением 0,4кВ, марка кабеля АВВГ 3*185), протяженность кабеля 390,0 м, протяженность участка 182,1 м; - водопроводная сеть (материал труб – чугун, d-100 мм); - канализационная сеть: трубопровод безнапорный (материал труб – чугун, d-100 мм), трубопровод безнапорный (материал труб – керамика, d-150 мм); - тепловая сеть: участок сети от УЗ-1 до УЗ-2 (трубопровод тепловой сети, материал труб – сталь, 2d-125 мм), участок сети от УЗ-2 до УЗ-3 (трубопровод тепловой сети, материал труб – сталь, 2d-100 мм), участок сети от УЗ-3 до УЗ-4 (трубопровод тепловой сети, материал труб – сталь, 2d-50 мм), участок сети от УЗ-4 до УЗ-5 (трубопровод тепловой сети, материал труб – сталь, 2d-76 мм), участок сети от УЗ-4 до ввода в здание (трубопровод тепловой сети, материал труб – сталь, 2d-76 мм), участок сети от УЗ-5 до ввода в здание (трубопровод тепловой сети, материал труб – сталь, 2d-40 мм)
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 423650100007000814, площадью 0,3489 га (назначение – обслуживание производственной территории) по адресу: г. Лида, ул. 8 Марта, 28Б. Примечания: земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранных зонах линий электропередачи, код – 6, площадью 0,0175 га; земли, находящиеся в охранных зонах магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных инженерных сооружений, код – 7, площадью 0,2750 га; земли, находящиеся в охранных зонах линий связи и радиофикации, код – 5, площадь 0,0074 га
Обременения со стороны третьих лиц	Договор об ипотеке № 1и-13 от 31.01.2013 г. между ОАО «Лидская обувная фабрика» и ЗАО «Банк ВТБ» (Беларусь) Региональная дирекция № 400, договора аренды: помещение площадью 89,6 кв.м – до 01.09.2017 г.
Начальная цена продажи	690 684 (шестьсот девяносто тысяч шестьсот восемьдесят четыре рубля) с учетом НДС
Сумма задатка	69 068,40 р. (шестьдесят девять тысяч шестьдесят восемь рублей сорок копеек)
Продавец	ОАО «Лидская обувная фабрика», 231300, г. Лида, ул. Фабричная, 6, тел./факс 8-0154-52-16-61
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32
Условия аукциона	Без условий
Условия оплаты	100% предоплата в течение трех календарных дней
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225
Аукцион состоится 17 августа 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209	

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), с 8.30 до 16.30 (пятница).

Последний день приема заявлений – 11 августа 2016 г. до 15.00.

Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» Дополнительная информация http://grodnoino.by/

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2016 г.

(в миллионах белорусских рублей, данные до деноминации)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2016	01.07.2015
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	17 962	12 239
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	78	1 992
5	Средства в банках	1104	346 729	1 144 829
6	Ценные бумаги	1105	3 391 505	1 652 943
7	Кредиты клиентам	1106	75 758	371 677
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	80	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	124 131	30 771
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	588 013	100 684
12	Отложенные налоговые активы	1111	-	4 421
13	Прочие активы	1112	176 148	106 085
14	ИТОГО активы	11	4 720 404	3 425 641
15	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
16	Средства Национального банка	1201	-	59 000
17	Средства банков	1202	3 198 154	2 456 869
18	Средства клиентов	1203	10 526	10 242
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	-	-
20	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
21	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
22	Прочие обязательства	1207	888	1 985
23	ВСЕГО обязательства	120	3 209 568	2 528 096
24	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
25	Уставный фонд	1211	616 505	616 505
26	Эмиссионный доход	1212	168	168
27	Резервный фонд	1213	133 529	106 609
28	Фонды переоценки статей баланса	1214	12 776	17 910
29	Накопленная прибыль	1215	747 858	156 353
30	ВСЕГО собственный капитал	121	1 510 836	897 545
31	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	4 720 404	3 425 641

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2016 г.

(в миллионах белорусских рублей, данные до деноминации)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2016	01.07.2015
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	371 108	116 366
2	Процентные расходы	2012	65 945	54 956
3	Чистые процентные доходы	201	305 163	61 410
4	Комиссионные доходы	2021	803	324
5	Комиссионные расходы	2022	282	321
6	Чистые комиссионные доходы	202	521	3
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	3 628	(3 504)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	(10 294)	201 555
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	-	40 787
11	Чистые отчисления в резервы	207	(374 050)	192 506
12	Прочие доходы	208	35 783	10 290
13	Операционные расходы	209	38 678	34 956
14	Прочие расходы	210	3	9
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	670 170	83 070
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	128 716	12 255
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	541 454	70 815

Председатель Правления В.Н. Горожанкин

И.о. главного бухгалтера Н.А. Тиванова

Дата подписания «05» июля 2016 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь, № 30 от 19.06.2013, БИК 153001333, УНП 807000163.

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Полоцк-торг», Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Евфросиньи Полоцкой, д. 21**
Предмет аукциона	
Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, г. Полоцк, ул. Мариненко, 5	

Наименование	Назначение	Общая площадь	Инвентарный номер
Магазин №56	Торговое помещение	197 кв. м	250/D-1103
Здание склада	Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ	117 кв. м	250/С-11397

Составные части и принадлежности	Основная пристройка
Сведения о земельном участке	Земельный участок, площадью 0,0531 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания магазина №56
Обременения	Арендатор. Подробная информация на сайте организатора аукциона
Начальная цена с НДС 20% – 86 659 рублей 20 копеек (снижена на 40%). (866 592 000 белорусских рублей)	
Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок подписания договора купли-продажи	**10** рабочих дней после проведения аукциона
Условия оплаты предмета аукциона	
Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**	
Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 04.06.2016 г.	
Дата и время проведения аукциона	**25.07.2016 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**22.07.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные телефоны	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by**

Утерянные страховые полисы по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РП, 2РН серии БА 0709173, 0709174, 0709175, 0709176, 0709177, 0709178, 0709179, 0709180, 0709189, 07092190, 0709191, 0709192, 0709193, 0709194, 0709195, 0709196, 0709197, 0709198, 0709199, 0709200, 0709201, 0709202, 0709203, 0709204, 0710207, 0710208, 0710209, 0710210, 0710211, 0710212, 0710213, 0710214, 0710216, 0710217, 0710218, 0710219, 0710220, 0710221, 0710222, 0710223, 0765338, 0765339, 0765340, 0765341, 0765342, 0765343, 0765344, 0765345, 0765346, 0765347, 0765348, 0765349,0765350, 0765351, 0765352, 0765353, 0765354, 0765355, 0765356, 0765357, 0765358, 0765359, 0765360, 0765361, 0765362, 0765363, 0765364, 0765365, 0765366, 0765367, 0765368, 0765369, 0765370, 0765371, 0765372, 0765373, 0765374, 0765375, 0765376, 0765377, 0765378, 0765379, 0765380, квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС 8521792, 8521793, 8521794, 8521795 страховой компании «Промтрансинвест» **считать недействительными.**

Фондом «Гроднооблимущество»

28 июля 2016 года в 12.30 по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39 проводится аукцион по продаже имущества, находящегося в собственности Волковысского района.
Начальная цена предмета аукциона 29 базовых величин.
Размер задатка – 1 базовая величина.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – **22 июля 2016 г. до 12.00**

ПРЕДМЕТ АУКЦИОНА: КОМПЛЕКС ЗДАНИЙ, СООРУЖЕНИЙ ЦЕХА ПО ПРОИЗВОДСТВУ КРАСНОГО КИРПИЧА.

Имущество расположено по адресу:
г. Волковыск, ул. Осипенко, 21, 21/1-21/3, 21/8, 21/11-21/14.
Контактные телефоны: (8-01512) 4 50 25, 4 32 92, (8-0152) 77 29 15, 72 25 18.
Подробная информация об объекте на сайтах:
http:// region.grodno.by; http://volkovysk.grodno-region.by, volkvkh.by.

УНП 500042135

БАНК ТОРГОВЫЙ КАПИТАЛ

Закрытое акционерное общество

Наименование банка: **ЗАО «ТК Банк»**

www.tcbank.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2016 г.

(в миллионах белорусских рублей, данные до деноминации)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2016	01.07.2015
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	38 609	21 150
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	62 288	17 066
5	Средства в банках	1104	146 989	44 392
6	Ценные бумаги	1105	51 043	145 549
7	Кредиты клиентам	1106	480 302	315 196
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	-	-
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	94 992	64 224
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	14 008	2 224
12	Отложенные налоговые активы	1111	-	-
13	Прочие активы	1112	44 137	16 079
14	ИТОГО активы	11	932 368	625 880
15	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
16	Средства Национального банка	1201	-	-
17	Средства банков	1202	26 131	817
18	Средства клиентов	1203	490 584	264 134
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	48 285	-
20	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
21	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
22	Прочие обязательства	1207	3 853	9 579
23	ВСЕГО обязательства	120	568 853	274 530
24	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
25	Уставный фонд	1211	149 487	149 487
26	Эмиссионный доход	1212	-	-
27	Резервный фонд	1213	13 974	9 609
28	Фонды переоценки статей баланса	1214	54 536	41 337
29	Накопленная прибыль	1215	145 518	150 917
30	ВСЕГО собственный капитал	121	363 515	351 350
31	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	932 368	625 880

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**Лот №1 Рассеиватель минеральных удобрений дисковый РДУ-3,0, новый, начальная стоимость лота – 9269.01 белорусского рубля**
Собственник (владелец) имущества	Открытое акционерное общество «Технолит-Полоцк»
Местонахождение имущества	г. Полоцк, ул. Ленинградская, 101. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к Табачниковой Светлане Александровне, тел. 8 (029) 712-75-13
Наличие обременений	Залог ОАО «БПС-Сбербанк»
Место (адрес), дата и время проведения торгов	Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 1.4 11 августа 2016 года в 11.00
Справочная информация об организаторе торгов	Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 Судебный исполнитель Атрахимович Николай Александрович, тел. (0212) 61 40 24 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 15.00 10 августа 2016 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги

ООО «Центр Белинвентаризация»

г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1

- Пересчет долей в связи с изменением капитального строения
- Раздел и вычленение недвижимости и земельных участков
- Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Гомельское ПО «Кристалл» – управляющая компания холдинга «КРИСТАЛЛ-ХОЛДИНГ» 8 (0232) 27 95 41

№ лота	Наименование объекта	Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС	Сумма задатка, бел. руб.
1	Капитальное строение (навес для хранения химтоходов) с инв. № 350/С-110737, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Ильича, 331, составные части и принадлежности: навес площадью 287,0 кв. м на металлических опорах в количестве 24 шт., асфальто-бетонная площадка площадью 368,0 кв. м, железобетонная опора – 10 шт, подкрановый путь. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000007006664 площадью 0,1593 га	**24 600 руб. 00 коп. (в денежных знаках образца 2000 года 246 000 000)**	**2 460 руб. 00 коп. (в денежных знаках образца 2000 года 24 600 000)**
Срок подачи заявления	**По 11 августа 2016 г.** в рабочие дни с 9⁰⁰ до 16⁰⁰ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**		
Дата, время, место проведения аукциона	**15 августа 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1**		
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012178339010 в Региональной Дирекции №300 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 491323266 Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация»		
Условие пользования	Объект продается в собственность		
Условия продажи	Шаг аукционных торгов – 5%, оплатить стоимость объекта, сформированную на аукционе, в течение 30 календарных дней с момента подписания договора купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона		
Дополнительная информация по тел. 8 (029) 341 15 45			

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ООО «Центр Белинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
8. Участник аукциона, выигравший торги, либ

Шлях радасці

Фота Надзеі БУЖАН.

Дарога. Няпростая і роўная, з выбоінамі і без, насычаная камянямі, якія рэзка, непрыемна аддаюць у ступнях. Але боль слабы, калі побач з табой аднадумцы, а наперадзе — чаканая сустрэча. Карэспандэнт «Звязды» разам з пілігрымамі прайшоў 126 кіламетраў да славутага цудатворнага абраза ў Будславе, занатаваў самае цікавае і зразумеў, што фізічныя пакуты могуць быць нічым у параўнанні з радасцю ад дасягнутай мэты.

Ранак буднага дня. Вялікі горад толькі прачынаецца пасля спякотных выхадных, а мінакі спяшаюцца на работу. Каля Архікафедральнага касцёла імя Найсвяцейшай Дзевы Марыі ўсё наадварот. Тут пануе спакой і амаль ніякай мітусні. Прастора каля касцельнага кіёска застаўлена заплечнікамі, сакваяжамі. Там і тут у чахлах ляжаць палаткі, звязаныя турыстычныя дыванкі і чакаюць фуру, што з рэчамі будзе суправаджаць пілігрымаў у дарозе. Іх уладальнікі спакойна размаўляюць каля ўвахода. Астатнія ўкленчылі ў храме, засяроджана, з малітвай рыхтуюцца да няпростага падарожжа. Я гляджу на гадзіннік і разумею, што да пачатку пешага паломніцтва застаецца гадзіна. Але яна растала вокамгненна, як марозіва на пякучым сонцы. Раздаўся свісток, і больш за дзвесце чалавек у калоне рушылі наперад.

* * *

На першым кіламетры ты толькі і ловіш на сабе дапытлівыя позіркі прахожых. Нехта з людзей пазірае на цябе насцярожана, нават абыякава, а нехта адказвае ўсмешкай на ўсмешку, ветліва махае рукой у адказ. Каля Палаца Рэспублікі вясёлыя дзяўчаты выскачылі на офісны балкон і з інтарэсам здымаюць нас на мабільныя тэлефоны. Дваістасць ва ўспрыманні захаваецца і надалей. Але найбольш уразіла праваслаўная манахіня, якую пілігрымы спаткалі ў Навінках, на выездзе з Мінска. Убачыўшы ўдалечыні крыж, жанчына пяражагналася, дачакалася паломнікаў і благаславіла іх у добры шлях.

* * *

Пілігрымы рушаць калонай. З аднаго боку іх абмяжоўвае край дарогі, з другога — даўжэзны шнур у руках людзей, які не дазваляе ім выйсці на праезную частку. За тым, каб машыны з паваротаў не выязджалі наўпрост на людзей, сочаць хлопцы са сцяжкамі і рацыямі для сувязі. Яны нібыта тыя рэгуліроўшчыкі, што часова спыняюць рух на дарогах. Працуюць ладна, без затрымак. Часам за шэсцем збіраецца невялічкая чарга з машын. Але ніхто з кіроўцаў не нервуецца. Паводзяць яны сябе даволі карэктна.

Наперадзе нясуць драўляны крыж. У чыіхсьці руках на ветры развяваюцца сцягі Мінска і Ватыкана. Крыху далей ідзе мужчына з калонкай. Усе хрысціянскія песні спяваюць пад гітару, і дзякуючы калонцы словы чуваць нават у канцы калоны. А калі ўся пілігрымка пачынае спяваць хрысціянскую песню «Вольная Воля», спеў літаральна запаўняе сабой навакольную прастору. І ты толькі чуеш, як дзесьці наперадзе дзясяткі галасоў паўтараюць рэфрэн: «Уставай і кроч разам са мной, я іду за Хрыста і Касцёл».

* * *

На другім прывале ў вёсцы Паперня пад шатамі дрэў слова трымае ксёндз Кірыла Бардонаў. Але не паспеў ён цалкам сфармуляваць сваю думку, як над галовамі ўладкаваных на дыванках пілігрымаў праносяцца рэактыўныя самалёты. Праз хвіліну айцец Кірыл працягнуў сваю думку пра духоўную важнасць пілігрымкі, ды ў паветры зноў з'явіўся знішчальнік.

— Ну вось, можна і на парад не ісці, — пажартаваў нехта з прысутных. — Рэпетыцыю ж ужо пабачылі!

Акрамя Кірыла Бардонава ўсе пяць дзён з пілігрымамі праводзіць яшчэ адзін святар — Дзмітрый Дубовік, які працуе ў парафіі Святой Барбары ў вёсцы Замосце, пад Слуцкам. Часам здаецца, што ў гэтага ўсмешлівага, актыўнага святара на спіне пад сутанай схаваны маторчык. Нават у такую спёку, ад якой пот засцілае вочы, ён з хуткасцю спартсмена бегае ўздоўж калоны. Заахвочвае рухацца хутчэй тых, хто крыху адстаў, пастаянна падбадзёрвае, часам запускае наперадзе хвалю, якая аддаленна нагадвае тую, што пускаюць на стадыёнах заўзятары. Кожную раніцу менавіта ягоны свісток склікае ўсіх на малітву і сняданак. Хоць сам ксёндз Дзмітрый сцвярджае, што бегаў раней, цяпер проста абыходзіць вернікаў і размаўляе з імі.

— У кіраванні пілігрымкай галоўнае, каб усе былі задаволеныя, — лічыць ён. — Менавіта да гэтага трэба імкнуцца. Калі чалавек у дарозе будзе адчуваць радасць, тады ўсё атрымаецца належным чынам. У нашай пілігрымцы ідуць больш за 200 чалавек. Лічу, гэта аптымальная колькасць удзельнікаў. Такім паломніцтвам і кіраваць прасцей. Праз некалькі дзён ты ўжо ведаеш, хто, якія мае патрэбы. Што тычыцца нашага маршруту, ён ужо даўно не мяняецца. Праблема толькі ў тым, што першая каталіцкая парафія з'яўляецца на нашым шляху ў Альковічах, куды прыходзім на трэці дзень. Дагэтуль начуем у школах. Але ў будучыні плануем ставіць вялікія палаткі, каб пазбавіцца залежнасці ад некаторых месцаў.

Ксёндз Кірыл БАРДОНАЎ:
— Пілігрымка — час, калі ты адрываешся ад штодзённасці, хатніх клопатаў. Не жывеш па інерцыі, як гэта робіш звычайна, а вырываешся падчас і з манатоннасці. Чалавек выходзіць з зоны камфорту і проста трапляе ў зусім іншую жыццёвую сітуацыю.

* * *

Штодзённы графік пілігрыма, насычаны 20—30-кіламетровымі пешымі кідкамі, нагадвае армейскі расклад. Пад'ём у 6:00, адбой — у 22:00. Пасля адбою людзям, безумоўна, дазваляецца размаўляць, але толькі так, каб клацанне абуткам і размовы не перашкаджалі адпачываць астатнім. Першыя два дні пілігрымы начавалі ў школах — у вёсках Вішнёўка і Калачы. Адну з начэй я правёў пад пледам у звычайным класе, другую — у вялікай, прасторнай спартыўнай зале. Самыя спрактыкаваныя хлопцы клаліся наўпрост на спартыўныя матрацы. Тым, каму не хапіла, засыналі ў сваіх спальных мяшках. Ніякіх нязручнасцяў гэта не выклікала. Пасля трыццацікіламетровага адрэзка ў другі дзень да Калачоў хацелася аднаго — легчы і заснуць.

* * *

Кухня пілігрыма — асобная гісторыя. За два дні многія з'ядаюць хатнія ссабойкі і застаецца толькі вада, без запасаў якой проста немагчыма. Гатуюць пілігрымам на звычайнай палявой кухні. Але гэта ніяк не ўплывае на смак прыгатаванага. За ўвесь час я не сустрэў таго, хто б быў незадаволены якасцю страў. Меню, зразумела, не рэстараннае, але ўся ежа даволі сытная. На сняданак — грэчка, на абед — суп з бульбай, на вячэру — макароны з мясам. З напояў на кухні вараць гарбату. Ну а калі табе і гэтага не хапае, сёе-тое можна набыць у вясковых крамах, дзе звычайна пілігрымы ў гарачую пару скупляюць пітную ваду, марозіва, вафлі ці печыва.

* * *

З чарнявай Жэняй Турчыной, медыкам па адукацыі, за пяць дзён дарогі пазнаёміўся ледзь не кожны пілігрым. Штодня да Жэні і яе напарніц выстройваюцца сапраўдныя чэргі. Яна ўладкоўваецца на дыванку каля сваёй палаткі і скрупулёзна прабівае мазалі, выдаткоўвае пластыр і пену, якая ратуе ад бязлітаснага сонца. Дзякуй Богу, сур'ёзных пашкоджанняў ніхто не атрымаў. Хоць людзі падчас пілігрымкі бывае трацяць прытомнасць, збіваюць ногі. Галоўнае, каб не было таго, што здарылася колькі гадоў таму, калі дзяўчынку з апендыцытам прыйшлося везці ў мінскую бальніцу. Напрыканцы пілігрымкі Жэня сама стала ахвярай няпростай дарогі, але ўсё роўна паспявае дапамагаць і сабе, і тым, хто мае ў гэтым патрэбу.

— Былі выпадкі, калі чалавек хоча ісці, аднак з-за стану здароўя пілігрыма прыходзілася вяртаць дадому, — кажа ксёндз Кірыл Бардонаў. — Усё ж такі трэба разлічваць свае сілы, і нельга неабдумана рызыкаваць сваім здароўем. Бог не прымушае да гераічнасці. Хвароба верніка пасля паломніцтва, якая не дазваляе яму выконваць свае абавязкі, — не тое, чаго мы чакаем ад пілігрымкі. Мы хочам, каб у чалавека наадварот з'яўлялася яшчэ больш духоўных сіл і ён станавіўся лепшым бацькам, маці, настаўнікам.

* * *

Пілігрымка — гэта пастаянныя развагі, малітвы, унутраны дыялог. Але ісці і не кантактаваць з тым, хто ідзе разам з табой, немагчыма. Падчас «пяці хвілінак для сяброў», як празвалі перапынкі паміж малітвамі, на прывалах, даведаўся, што ідуць не толькі мінчане, але і жыхары Бабруйска, Слуцка, Асіповічаў, Саратава. Рушыў з намі нават студэнт з Прагі Хонза Дойч... Да Будслава ідзе оперная спявачка і машыніст метро, сястра-законніца і манах, семінарыст і школьнік, настаўніца і будаўнік, журналіст і выхавацелька дзіцячага садка. Побач са мной чатырохгадовага сына Яна-Тадэвуша ў калясцы коціць бацька Яўген Апанасевіч. Малы ў паломніцтве адчувае сябе выдатна, не наракае і ў вольны час ад пераходаў лётае, як верталёт.

У пілігрымку рушаць звычайна аднадумцы, людзі з падобнымі поглядамі на жыццё, а таму нават паступіла жартаўлівая прапанова арганізаваць «Бюро знаёмстваў» для тых, хто шукае другую палавінку. Тэма асабістых стасункаў тут, зразумела, не дамінуе, але некаторыя дзяўчаты сышліся на тым, што добра было б пайсці ў пілігрымку са сваім хлопцам, каб праверыць таго на трываласць. Не ведаю, ці былі адмоўныя выпадкі, але беларускі фатограф Віктар Малышчыц, майстар начных пейзажаў, спаткаў будучую жонку Насцю менавіта ў пілігрымцы Мінск — Будслаў.

* * *

Падчас абеда ў Жукаўцы, дзе пілігрымы спыніліся каля праваслаўнай царквы, здарыўся даволі цікавы выпадак.

Да знаёмых, што адпачывалі пад царкоўным плотам, падышла расхваляваная жанчына.

— Згубіла ружанчык і ніяк не магу яго знайсці, — звярнулася да іх верніца.

— А вы Святому Антонію памаліцеся (да яго каталікі звяртаюцца ў тым ліку пры страце рэчаў. — **Аўт.**), — падказалі ёй суразмоўнікі. — Ён дапаможа.

Не прайшло і пяці хвілін, як жанчына вярнулася ўсцешаная, з усмешкай.

— Святы Антоній, — коратка сказала тая, трымаючы ў руках пацеркі. — Што гэта, калі не цуд? Знайшла ружанец пад турыстычным дыванком...

* * *

Дасведчаныя пілігрымы нагадваюць мне вопытных маракоў, марскіх ваўкоў, у якіх на кожны выпадак ёсць свая гісторыя. Юлія Казіміровіч хоць яшчэ і атрымлівае вышэйшую адукацыю, але ідзе ў пілігрымку да Будслава ўжо чатырнаццаты раз.

— Для пілігрыма схадзіць у лазню — вялікая справа. І падчас адной з пілігрымак у нас атрымалася гэта рабіць штодня, — з усмешкай прыгадвае Юля. — Пра лазню мы не прасілі людзей, яны самі прапаноўвалі. Гэта было як Божае благаслаўленне. А гады тры таму ў апошні дзень пілігрымкі перад самым Будславам нас накрыла такая моцная навальніца, што не было дзе схавацца. Ніякія джавікі ўратаваць не маглі. Нават тэлефоны пазалівала. Калі заходзілі ў касцёл, вады было сантыметраў дваццаць. Так шмат з вільготнага адзення накапала. І мы станавіліся ў воду на калені, рушылі да алтара. Але гэта не перашкаджала, каб аддаць пашану Маці Божай.

* * *

У Стайках, Камене, Альковічах, Акцябрскім і Даўгінаве мясцовыя жыхары доўга не выпускаюць пілігрымаў з абдымак гасціннасці. Іх прыход для многіх сапраўднае свята. Кожны тыдзень вяскоўцы бачаць выключна суседзяў і аўталаўку, а тут такі ажыятаж. Пілігрымаў сустракаюць хлебам і соллю. Выносяць на панадворак сталы, ставяць бідоны з калодзежнай вадой, слоікі з кампотам, талеркі з печывам і цукеркамі. А ў Камене пілігрымам наогул зладзілі сапраўдны абед. Для іх прыгатавалі халаднік, бутэрброды, нарэзалі свежую гародніну, нехта нават прынёс хатні кефір.

Апошнія дзве ночы перад Будславам начуем з пілігрымамі ў Мацькаўцах і Даўгінаве — у Алы Белаковай і Галіны Сяліцкай. Многіх паломнікаў тут заўжды чакае распаленая лазня, смачная вячэра і мяккая пярына.

А для тых, хто вырашыў спаць у палатках, але хоча схадзіць у лазню, у Даўгінаве, дзе адначасова сабраліся пілігрымы з розных гарадоў, гаспадары дамоў павязвалі на агароджах стужачкі — апазнавальны знак. І такі ход неўзабаве сябе апраўдаў. Ад ахвотных схадзіць у лазні не было адбою.

* * *

Пілігрымка — не вандроўка. Тут ніхто не будзе ў мікрафон расказваць масу анекдотаў, гісторыі мясцін, якія праходзіш. Ад цябе чакаюць павагі да ўсіх тых, з кім ты ідзеш. Правілы паводзінаў пілігрымаў ніхто не раздрукоўвае, але яны ёсць і агаворваюцца яшчэ напачатку. Пажадана як мага менш кантактаваць па тэлефоне, не паліць і не піць. Айцец Кірыл кажа, гэта найперш дрэнны прыклад для іншых людзей, сярод якіх можа быць той, хто на час паломніцтва адмовіўся ад падобных спакус. Дрэс-код таксама існуе. Нягледзячы на спёку, дзяўчатам непажадана надзяваць празмерна кароценькія шорты і вузкія легінсы. Асабліва гэта тычыцца апошняга дня, калі ты ўваходзіш у Будслаў. Спрактыкаваныя рушылі ў лёгкіх доўгіх спадніцах, а нехта — у звычайных штанах. Калі чалавек пастаянна не рэагуе на заўвагі, паводзіць сябе неадэкватна, яго могуць адправіць дадому. Але выпадковыя людзі ў пілігрымцы таксама сустракаюцца. Ксёндз Дзмітрый Дубовік расказвае, як летась некалькі чалавек з брэсцкай пілігрымкі збеглі ўжо на другі дзень, калі атрымалі майку і бэйджык. «Калі нехта хоча ўбачыць у пілігрымцы турыстычны паход, расчароўваецца даволі хутка», — дадае ён. Кожнаму сваё, аднак абсалютная большасць усё роўна рушыць у Будслаў з-за духоўнай патрэбы.

— Пілігрымка — гэта такі міласэрны час, калі можна вучыцца любіць, — разважае Роза Міхайлоўская са Слуцка. — Кожны з нас нясе Хрысту свае падзякі, перапрашэнні, ціхія інтэнцыі ў сэрцы. І я пайшла таму, што хачу быць сведкам Хрыста, а душа прагне праслаўляць Бога.

* * *

Кульмінацыяй нашай рэлігійнай вандроўкі становіцца апошні дзень, калі выходзім з Даўгінава на Будслаў. Па дарозе спыняемся ў Ваўкалатцы. Адзін з гаспадароў, які адкрыў калодзеж перад пілігрымамі, раіць як мага больш набіраць вады, бо да Будслава вёсак ужо не будзе. Затое наперадзе нас сустракае шмат пілігрымаў з іншых гарадоў, якія прыселі адпачыць каля дарогі. Але яшчэ большую шчырасць адчуваеш ужо перад самым Будславам, калі падымаешся на так званую гару перапрашэння. Кожны кожнаму глядзіць у вочы, абдымаецца і перапрашае за тое, што зрабіў не так за апошнія пяць дзён. Магчыма, ты ўжо ніколі не сустрэнешся з кімсьці з гэтых людзей, але ўдзячны ім за падтрымку, братэрскасць. І цяпер ты цалкам разумееш, што нездарма некаторыя пілігрымы называюць адно аднаго братамі. Разам з кожным з іх за гэты тыдзень ты паспеў перажыць многае. Як духоўна, так і фізічна.

Тарас ШЧЫРЫ. *taras@zviazda.by*

Больш фота — на сайце zviazda.by

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

НЕ ПЛОДАНОСЯЦЬ ВІШНІ

Багатае цвіценне вішні не заўсёды гарантуе яе добры ўраджай. Даволі часта кветкі проста ападаюць, не ўтвараючы завязяў, або завязі ў далейшым практычна цалкам вішняй скідаюцца.

Вішня адносіцца да раслінаў, у якіх завязь узнікае, калі на тычынку кветкі трапляе пылок іншага сорту. Усе вішні падзяляюцца на самабясплодныя, часткова самаплодныя і самаплодныя. Самабясплодныя здольныя забяспечыць сваім пылком з'яўленне ўсяго толькі каля 5 працэнтаў завязяў. У часткова самаплодных сартоў вішань пры дапамозе свайго пылка завязваецца прыкладна 20 працэнтаў плодзікаў, а ў самаплодных апыляецца больш за палову сваіх кветак. Адпаведна ў самабясплодных і часткова самаплодных паўнавартаснага апылення не адбудзецца, калі побач не расце вішня-апыльнік рэкамендаванага сорту. Перыяд яе цвіцення павінен супадаць з цвіценнем расліны, якую трэба апыляць. Добрымі апыльнікамі лічацца вішні сартоў Уладзіміраўская, Любская, Шубінка.

Менавіта з гэтай прычыны для атрымання высокага ўраджаю практыкуецца закладанне цэлых вішнёвых садоў. Вішня не любіць адзіноты. Нават для самаплодных сартоў прысутнасць побач іншых вішань пойдзе на карысць.

Таму, саджаючы ў садзе вішню, лепш выкарыстоўваць каранёвыя атожылкі толькі ад загадзя пладаносных дрэў і не абмяжоўвацца адным гатункам.

Негатыўна на апыленні вішні могуць адбіцца і дрэнныя ўмовы надвор'я ў перыяд яе цвіцення. Напрыклад, падчас пахаладання і прыдажджлівым надвор'і зніжаецца актыўнасць дзейнасці пчол і іншых насякомых-апыляльнікаў, якія збіраюць нектар на кветках. Пры вельмі гарачым надвор'і якасць пылку зніжаецца і ён хутчэй абсыпаецца.

Ападанне завязяў — гэта натуральны працэс ва ўсіх пладовых дрэў. Як правіла, акрамя непаўнавартасных і пашкоджаных, скідаюцца таксама і лішнія завязі. Дрэва самарэгулюе колькасць і якасць пладоў, якія яно можа вырасціць. Калі ж вішня скідвае амаль усе свае завязі, значыць, яна адчувае сябе вельмі некамфортна. Прычын таму можа быць даволі шмат.

Вішні даволі капрызныя да месцазнаходжання і саставу глебы. Яны вельмі не любяць блізка размешчаных грунтовых вод. Лічыцца, што пад вішнямі грунтовыя воды павінны быць глыбей за 1,5—2 метры. Калі яны бліжэй, трэба саджаць вішні на насыпное ўзвышша дыяметрам каля 2—3 метраў і вышынёй, пры якой вытрымліваецца неабходная глыбіня залягання грунтовых вод. Лепш за ўсё вішні развіваюцца на супясчаных глебах з кіслотнасцю, набліжанай да нейтральнай. Іншую кіслотнасць неабходна карэктаваць вапнаваннем глебы.

На ўраджаі адмоўна адбіваецца загушчанасць кроны. Патрэбны рэгулярная абрэзка і прарэджванне. У першую чаргу выдаляюцца сухія, пашкоджаныя галінкі, а таксама тыя, якія пераплятаюцца і накіраваныя ўнутр кроны. Для дрэвападобных і кустападобных формаў вішні метады абрэзкі адрозніваюцца. Галінкі дрэвападобных формаў абразаюцца прыкладна на адну траціну даўжыні, а галінкі кустападобных — да першага нармальнага разгалінавання. У абодвух выпадках ставіцца мэта прарэдзіць, прыбраўшы непатрэбныя, крону і забяспечыць прырост новых парасткаў.

Для больш інтэнсіўнага выспявання ягад вішні часта не хапае пажыўных рэчываў, таму неабходна перыядычнае ўнясенне падкормак па наступнай схеме: увосень, пад перакопку прыствольнага круга, пад кожнае дрэва ўносяцца 150—200 г фосфарных і 50—70 г калійных угнаенняў; ранняй вясной даюцца азотныя ўгнаенні (мачавіна або аміячная салетра) у колькасці 50—70 г. Таксама пажадана ажыццявіць дзве падкормкі ў перыяд вегетацыі. Першую — адразу пасля заканчэння цвіцення вішні, другую — праз два тыдні пасля першай. Пры гэтых падкормках уносіцца пад кожнае дрэва 10 л вады з разведзенымі 20—25 г суперфасфату і 10—15 г хлорыстага калію і мачавіны. Станоўчы эфект дасць унясенне раз на два гады, пры асенняй перакопцы, перапрэлага гною.

Нягледзячы на тое, што вішня вызначецца засухаўстойлівымі якасцямі, усё ж такі пажадана правесці тры шчодрыя, з разліку 5—6 вёдзер на дарослае дрэва, палівы. Першы паліў праводзяць пасля заканчэння цвіцення, можна сумесна з першай летняй падкормкай. Другі — пры пачатку паспявання ягад, і трэці — пад зіму, у канцы верасня — пачатку кастрычніка, пасля скідання вішнямі лісця.

Даты. Падзеі. Людзі

13 ЛІПЕНЯ

1866 год. Нарадзіўся (в. Нача Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці) Чарноцкі Напалеон Казіміравіч, беларускі публіцыст, перакладчык. У 1887 г. скончыў Слуцкую гімназію, у 1894-м — Маскоўскі ўніверсітэт. Працаваў урачом у Заходняй Беларусі і Літве. У 1904—1905 гг. мабілізаваны на Маньчжурскі фронт. У 1908—1912 гг. у эміграцыі ў Канадзе. З 1918 г. у Варшаве, потым — у Вільні. У 1922 г. уступіў у Польскую сацыялістычную партыю. З 1931 г. жыў у Лідзе. Аўтар успамінаў пра рэвалюцыйны рух, публіцыстычных артыкулаў. Памёр у 1937 г.

1941 год. Нарадзіўся Андросік Андрэй Фёдаравіч, беларускі рэжысёр. З 1971 г. рэжысёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы, з 1995 г. мастацкі кіраўнік Беларускага рэспубліканскага ТЮГа. Сярод значных пастановак: «Апошні журавель» А. Дударава і А. Жука, «Камедыя» В. Рудава, «Палачанка» А. Дударава і інш. Памёр у 2003 г.



1941 год. Пачалася Рагачоўска-Жлобінская аперацыя, контрудар савецкіх войскаў на Бабруйскім напрамку ў Вялікую Айчынную вайну, частка Магілёўскай бітвы. У ходзе аперацыі савецкія часткі змаглі больш чым на месяц скаваць 7 нямецка-фашысцкіх дывізій.

Было сказана

Міхась СТРАЛЬЦОЎ, пісьменнік:
«З гадамі душа цішэе, лагаднее, супакойваецца, але не засынае: яна, як і раней, шукае радасці, толькі ведае ўжо, што хоча іменна яе».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.55	21.35	16.40
Віцебск	4.37	21.32	16.55
Магілёў	4.45	21.25	16.40
Гомель	4.50	21.13	16.23
Гродна	5.12	21.49	16.37
Брэст	5.21	21.41	16.20

Месяц

Першая квадра 12.07—19.07. Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Андрэя, Варфаламея, Івана, Мацвея, Піліпа, Пятра, Сафрона, Сімона, Фадзея, Фамы, Юды, Якава.*
К. *Маргарыты, Андрэя, Генрыха, Яўгена.*

Фота Вольгі ЛУКШЫЦ.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА +20..+22°С	КІЕЎ +30..+32°С	РЫГА +22..+24°С
ВІЛЬНЮС +21..+22°С	МАСКВА +24..+26°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +19..+21°С

УСМІХНЕМСЯ

Кожная раніца ў мяне пачынаецца з акцыі:
«Пакармі ката і атрымай гадзіну спакойнага сну ў падарунак».

Мужык за абедзенным сталом з апетытам умінае катлеты. Насупраць яго жонка сумна возіць па талерцы нейкія лісцікі і сцяблінкі. Мужык:

— Зноў свайміслалацікамі душышся? Паела б нармальнай ежы.

— Ага, сабе толькі волю дай! Хочаш, каб я ў карову ператварылася?

— Карова, між іншым, якраз адну траву і есць. А ўсякія там львіцы, тыгрыцы і пантэры ядуць мяса і нядрэнна выглядаюць.

Зняўшыся ў кіно з Анджалінай Джалі і Мілай Ёвавіч, Канстанцін Хабенскі выдаліў нумар тэлефона Лізы Баярскай.

Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2783.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 12 ліпеня 2016 года.